

*Буквы не кусаюць* ☞ 3

# Ніва

**ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ**

*АЛЕГ РУДАКОЎ* ☞ 8



**http://niva.iig.pl**
**redakcja@niva.iig.pl**

**№ 37 (2574) Год L** | **Беласток, 11 верасня 2005 г.** | **Цана 2,00 зл.**

*Высокае мастацтва гарманічна ўпісалася ў свойскі краявід...*

# Памятка аб людзях

**— Гэта я зрабіў для іх і для сябе, — кажа дваццацідвухгадовы Павал Гжэсь. 27 жніўня г.г. адкрылася яго выстаўка фотаздымкаў меляшкоўцаў. З Меляшкоў Гарадоцкай гміны паходзяць ягоныя дзяды. Цяпер ён варшаўскі студэнт інфарматыкі і крэатыўнай фатаграфікі ў Чэхіі. Памаглі ў рэалізацыі дарагога праекта мясцовыя ўлады, мастак даклаўся да гэтага і з уласнай кішэні. Выстава павісіць на вясковых платах да 15 кастрычніка. Засталося яшчэ шмат негатываў, нявыкарыстаныя здымкі, з якіх мастак зробіць адбіткі і падорыць іх людзям.**

Калісьці паміж Гарадком і Меляшкамі, што раскінуліся на грудзе кіламетраў пяць ад яго, разлівалася возера. Гэтак было больш за пяцьсот гадоў таму. Значыць, Меляшкі — вёска не маладзейшая ад Гарадка, славутага замкам Хадкевічаў і тым, што з яго муроў манахі пайшлі па Супраслі па плывучым крыжы ў Супрасль ды там заснавалі манастыр. За Меляшкамі, за стадоламі, высяцца два курганы, меншы і большы, званыя Могілкамі. З Меляшкоў выво-


Фота МІРЫ ЛУКШЫ

*Павал Гжэсь шануе сваіх*

дзяцца Кастэнчыкі, Ярмолікі, Шыкуці, Рожкі, Лавіцкія, Дарашкевічы, Чамялі, Сікорскія, Крупіцкія, Пятэльскія, Марцінчыкі, Шусцікі, Госцікі, Карповічы, Ясінскія... Парodненыя з Грэсямі, Тарасэвічамі, Брысевічамі, Лукшамі, Пташынскімі, Завадскімі, Мікульскімі, Алдакоўскімі, Латышамі, Назаркамі, Глогерамі... Згэтуль выйшаў у свет „нашанівец" Янук Дарашкевіч... У хату, дзе да нядаўна жыла найменшая Янукова сястра Люба (дажыла ста гадоў без двух тыдняў), увечары завядзе нас ягоны сястрынец Янка Лавіцкі...


Фота МІРЫ ЛУКШЫ

*Крыся Пятэльская паказвае Маргарытцы сям'ю Назаркаў*

На свята, дзе паказаны Меляшкі сёння ў тыя тыдні, калі жыхароў і іх дамы здымаў Павал Гжэсь, панаехала гасцей, „як на тры вяселлі", і адчуваецца чыста беларускі дух мерапрыемства, якое вядзецца на роднай мове. Свае, сваякі, госці ад Таварыства сяброў Гарадоцкае зямлі, ад Вілы Сакрата, галерэі „Арсенал", упраў гміны, павета і ваяводства, Гарадоцкага дома культуры імя Кастуся Каліноўскага (цяпер ён проста ГОК), ад „Часопіса", ад іншых спонсараў — Яніны Станкевіч і фірмы Імпарт-экспарт Яўгена Гжэся... Павал Гжэсь, мінулагодні стыпендыст Фонду падтрымкі талентаў „Відок", рэалізаваў сваю ідэю-праект „Меляшкі" ад сэрца.

— Будзе яшчэ не адна выстаўка ў цэлай Польшчы, перш за ўсё ў Беластоку, — кажа Магдаліна Сіварская-Гадлеўская, старшыня фонду „Відок". — І, абавязкова, будзе выдадзены фотаальбом.

Меляшкі, першую вёску Беластоцкага краю, дзе пакладзены былі тратуары, прыбіралі гуртом, як калісьці перад кожным Першамаем. Сёння нарыхтавалі яны гасцям багатую пачостку, і самі ахвотна пагуляюць-патанцуюць, як на вяселлі. Бо часцейшыя тут мярліны... На Спленне пры славутых крыжах, з якога адзін малявалі сябры „Зоркі" (першы праект Сустрэч „Зоркі", якому памагаў Лявон Тарасэвіч — яго матуля родам з Меляшкоў, гэта быў крыж, аздоблены дзецьмі) бацюшкі адслужаць малебен. За ўсіх жывых. З усіх жывых меляшкоўцаў, хто ўвекавечаны Паўлікам, выставы не дачакалася адна — Фаіна Барода, з роду Кастэнчыкаў. Ейная ціхая труна стаіць на здымку пад хаткай. „Ніва" два гады таму гасціла ў Фані на сямідзесяцігоддзі, на якім гуляла ўся вёска ў святліцы... Сёння пад музыку „Хутара" ідзе ўся шумная кампанія праз вёску, гамоніць па-беларуску, глядзіць партрэты грамады. Высокае мастацтва гарманічна ўпісалася ў свойскі краявід.

На здымках Паўла ўсе людзі прэзентуюцца святочна, годна — ці ў парадным адзенні, ці на хвіліну адарваныя ад гаспадаркі. З унукамі, якія на момант заехалі ў госці, з коцікамі і сабачкамі, прысеўшымі каля ног, за імі відаць аўтамашыны, трактары, квітнеючыя яблыні... Ёсць і нядаўна асеўшыя на меляшкоўскай зямлі, ёсць дзяўчаты, якія заехалі на „Басовішча"...

— Іду па вёсцы, гляджу, успамінаю, — кажа Крыся Пятэльская на руках з наймалодшай, двухгадовай дачушкай. Яе старэйшая дачка беластачанка, студэнтка Марта — сяброўка Паўла (прыехала шмат калег) таксама часта наведвае дзядоў. Ніну і Валодзю. — І я сама шмат была забылася. Здзем тут разам па вёсцы, і ўсё азываецца ў душы... Гэта такая памятка будзе аб людзях, аб зямлі!

**Міра Лукша**

## *Палітыка* ☞ 2

*Міхась Андрасюк*

*Можна б паставіць пытанне: ці ў свеце, дзе ўсё мае палітычную афарбоўку, трэба звычайнаму грамадзяніну займацца палітыкай? Не трэба. Досвед ад мінулых вякоў дае тут адназначны адказ: палітыка — самая прамая, самая кароткая і самая недарэчная дарожка ў турму. Вядома, можна туды трапіць і па іншых прычынах, напрыклад, з-за крадзяжу, згвалтавання або гучнага скандалу...*

## *Свой дом* ☞ 2

*Уладзімір Хільмановіч*

*Беларус паводле кроўнай прыроды — гаспадар. Цяперашнія насельнікі беларускага горада — гэта ўчарашнія вяскоўцы. Яны нарадзіліся ў сваіх хатах і выраслі на панадворках, дзе іх бацькі і дзяды мусілі дбаць пра парадкаванне свайго дому і дабрабыт. Унутраная патрэба працаваць „на сябе", „на сваё" засталася на генетычным роўні...*

## *Дрыгавічы* ☞ 4

*Аляксей Мароз*

*Для гасцей, што прыбылі з цэнтральнай Польшчы, каб пазнаёміцца з тысячагадовым гарадзішчам, беларускія калектывы засведчылі, што ў Чыжоўскай гміне жывуць беларусы. Пра іх продкаў сведчаць раскопкі праведзеныя на гарадзішчы і на старым могільніку...*



## *Сакрат-герой* ☞ 9

*Мацей Халадоўскі*

*Сам герой вечара ўспамінаў пражытае. Як заўжды, выяўляў шмат пачуцця гумару, таксама і на ўласны конт, хоць бы ў справе характэрнага заікання:*

*— На прызыўной камісіі адзін афіцэр так слухаў мяне і слухаў ды ўрэшце сказаў: „Афіцэра з цябе не будзе, бо пакуль аддасі загад, вайна кончыцца!"*

## *У Сабятыне* ☞ 11

*Аляксандр Вярбіцкі*

*Царква ў Сабятыне налічвае звыш трохсот гадоў. А перад ёю стаіць крыж, які мае сумную гісторыю. Калі набліжалася адмена прыгону, адзін мужык вельмі радаваўся новым перспектывам, агітаваў за новым парадкам. Тады яго злавілі землеўладальнікі і павесілі на дрэва...*

*Словы шчырага спачування*
*нашай шматгадовай супрацоўніцы*
***Марыі ФЕДАРУК***
*з прычыны напаткаўшага Яе гора*
***— смерці мужа Мікалая —***
*выказвае Рэдакцыя.*

# Бі-бі-сі. Беластоцкі беларускі слоўнік



**(п — палітыка)**

*Дзейнасць органаў дзяржаўнай улады і дзяржаўнага кіравання, якая адлюстроўвае грамадскі лад і эканамічную структуру краіны, а таксама дзейнасць грамадскіх класаў, партый і іншых класавых арганізацый, грамадскіх груповак, якая вызначаецца іх інтарэсамі і мэтамі.*

*Так значэнне слова „палітыка" рассакрэчвае „Тлумачальны слоўнік беларускай мовы", які, трэба адразу сказаць, не паспявае за ходам рэальнага жыцця і эвалюцыяй дзяржаўнага ладу. Кожны беларус ведае, што ў слове „палітыка" можа завяршацца ўсё — узровень надояў малака ў калгасе „Шлях да вечнасці", дажджлівае надвор'е ў ліпені, футбольны мячык забіты „нашымі" ў „іхнія" вароты, а нават радок наіўнага верша пра першае каханне, калі не „на языке" ён, а „на мове".*

*Можна б паставіць пытанне: ці ў свеце, дзе ўсё мае палітычную афарбоўку, трэба звычайнаму грамадзяніну займацца палітыкай? Не трэба. Досвед ад мінулых вякоў дае тут адназначны адказ: палітыка — самая прамая, самая кароткая і самая недарэчная дарожка ў турму. Вядома, можна туды трапіць і па іншых прычынах, напрыклад, з-за крадзяжу, згвалтавання або гучнага скандалу, учыненага на п'яную галаву, але такія жыццёвыя памылкі зразумелыя кожнаму чалавеку і як першыя ў чарзе падлягаюць грамадскай амністыі і амнезіі. Палітыкай павінны займацца палітыкі. Вось і ўзнікае чарговая дылема: ці ў беларускіх умовах магчымы шлях ад звычайнага грамадзяніна да палітыка? Безумоўна, магчымы, асабліва калі трансфармацыя адбываецца са згоды дзяржаўнай улады, а пра факт уступлення новага чалавека на палітычную сцежку праінфармуе тэлебачанне ў галоўным выпуску „Панарамы". Без дазволу органаў і намазання дзяржаўнымі журналістамі можна ў лепшым выпадку апынуцца ў палітыканах, значыць, у беспрынцыповых дзеячах, спрытных дзялках, што нажываюцца на крыўдзе дзяржавы. У краінах, дзе грамадзяне прывыклі заходзіць у палітыку быццам у прадуктовую краму або ў піўную лаўку, спакон вякоў невырашальнай астаецца праблема: як зберагчы народ ад нашэсця ўсялякіх ашуканцаў-палітыканаў. У Беларусі, можна сказаць — на нашых вачах — гэтая праблема вырашаецца, а пры нагодзе ўзнікае ідэальная мадэль грамадства: палітык у краіне павінен быць адзін і ў такім выпадку нават самы някемлівы грамадзянін не пераблытае яго са звышмастацкай імітацыяй, хай сабе і адчаканенай на сапраўдныя грошы (долар, еўра).*

*Больш складаная сітуацыя ў выпадку беластоцкіх беларусаў. За апошнія пятнаццаць гадоў узніклі і замацаваліся тут два пункты гледжання адносна палітычнай актыўнасці. Першы грунтуецца на класічнай праўдзе — калі ты не будзеш займацца палітыкай, яна пацікавіцца табой. Значыць — дае адказ станоўчы: трэба выходзіць на сустрэчу з палітыкай, напрыклад, ствараючы свае выбарчыя камітэты, суполкі, няўрадавыя арганізацыі.*

*Другі пункт гледжання — дамінуючы — рашуча аспрэчвае патрэбу палітычнай актыўнасці і робіць стаўку на культурніцкую дзейнасць. Найчасцей выяўляецца яна танцавальна-вакальнымі фэстамі, якія прыцягваюць аграмадную кучу гледачоў і слухачоў. Арганізатары запрашаюць пры нагодзе таксама палітыкаў, вядома, не з мэтай папулярызаваць іх у мясцовым грамадстве, а звычайна, каб пераканаць іх у перавазе культуры над палітыкай. Метад, калі яго паўтараць у бясконцасць, наогул спрацоўвае. Здараецца, насыціўшы вушы, душу і сэрца цудоўнай беларускай песняй, палітык пачынае лічыць палітыку агіднай справай, чырванее ад сораму за ўсю сваю мінуўшчыну, а ў будучыні не адмаўляецца займацца палітыкай толькі таму, што можа служыць дзяржаве і грамадству як апалітычны спецыяліст.*

**Міхась Андрасюк**

# Свой дом



*...„І цёмнай ноччу і сама светлым днём як добра мець свой дом"...*

*Доўгімі днямі ў маім шматкватэрным доме пануе грукат і ляскат. Пачынаецца гэта з раніцы і канчаецца позна ўвечары. Часам здараецца нават уночы. А доўжыцца гэта амаль цэлы год, можа з перапынкам на самыя кароткія зімовыя месяцы. Тых, каго я заінтрыгаваў, мушу расчараваць, бо гутарка не пра загадкавы полтаргейст ці нейкія прывіды сівой даўніны. Гутарка пра сацыяльную з'яву, якая на постсавецкай прасторы называецца „рамонт". Нашы людзі проста апантаныя рамонтамі, а забіванне цвікоў, габляванне і струганне гэта іх найвялікшая жарсць, даведзеная да істэрыі.*

*Ёсць у гэтых паставе і дзеяннях падвойнае тлумачэнне. Першае натуральнае. Як ні стараліся (і стараюцца далей!) савецка-расійскія ідэолагі пераарабіць беларуса на маскоўца, ім гэта ніяк не ўдаецца. Беларус паводле кроўнай прыроды — гаспадар. Цяперашнія насельнікі беларускага горада — гэта ўчарашнія вяскоўцы. Яны нарадзіліся ў сваіх хатах і выраслі на панадворках, дзе іх бацькі і дзяды мусілі дбаць пра парадкаванне свайго дому і дабрабыт. Унутраная патрэба працаваць „на сябе", „на сваё" засталася на генетычным роўні.*

*З іншага боку ў светаглядзе чалавека адбылася падмена паняткаў. Людзі працуюць „на сваё", не маючы яго. Нашыя людзі не разумеюць, што насамрэч яны не маюць ніякага дому. Бо атрыманая праз усё працоўнае жыццё кватэра, якая для некаторых зусім недасяжная мара, ёсць для іх канцовай мэтай. Ім не належыць нават нажыты дзесяцігоддзямі скарб, бо чалавек і яго маёмасць абаронены праўна толькі фармальна. Старая брытанская прымаўка „Мой дом — мая крэпасць" не пра нашую краіну. У духоўных спадкаемцаў бальшавікоў, як той казаў, „цяперцаў", раней ці пазней з'явіцца ахвота ўсё забраць і падзяліць пароўну. Бальшавікі заўсёды былі майстры на сатанінскую тэрміналогію, якая хавала сутнасць з'яваў. Прыкладам, масавыя забойствы называліся „змаганнем з контррэвалюцыйнымі элементамі", а адбіранне маёмасці і рабаванне заможных людзей — „экспрапрыяцыяй".*

*Апошнім часам амаль усе шматкватэрныя дамы абсталёўваюцца жалезнымі дзвярамі з гучнікамі-дамафонамі. Але чысцей у пад'ездах ці бяспечней у кватэрах зусім не стала. Адно што „жалезная заслона" замінае апазіцыянерам раскідваць улёткі. А злачынстваў — кватэрных крадзяжоў паболела, пра што сведчаць адмысловыя інфармацыйныя матэрыялы, расклееныя паўсюль. Маўляў, стаўце, людцы, ахоўную сігналізацыю, якая адбароніць вас ад бандытаў. Ды самы найвялікшы рабаўнік у духоўным і матэрыяльным сэнсе — гэта бальшавіцкая дзяржава.*

*А можа проста чалавек прыходзіць з працы і ўсю накопленую за дзень адмоўную энергію ў вольны час аддае забавам з малатком і долатам. А што яшчэ рабіць, калі духоўных патрэбаў няма, а з жонкай ёсць шанцы хіба толькі на сварку. На мове псіхааналітыкаў гэта называецца „сублімацыя". Такі погляд праз фрэйдаўскія акуляры хіба таксама мае падставы, хоць і падаецца занадта спрошчаным. Як бы там ні было, нашым людзям няма калі думаць. Увесь вольны час ідзе на п'янкі-гулянкі, у перапынках якіх (а можа наадварот?) і адбываецца працэс „вечнага рамонту". І ніхто з гэтых руплівых грукачоў-стукачоў не разумее словаў незабыўнага паэта пра тое, што „ў гэтай краіне не маю я дому"...*

**Уладзімір Хільмановіч (Гродна)**




Фота Уладзіміра Хільмановіча

Вачыма еўрапейца

# У Беларусь



*Уздумаў я сабе, што пры нагодзе дзяржаўна афіцыйнага з'езду Саюза палякаў Беларусі выберуся ў Ваўкавыск, дзе ён праводзіўся, ды ў блізкае Гродна. Пасля вяртання хацелася мне падзяліцца з чытачамі „Нівы" ўражаннямі м.інш. з Гожы, дзе мае будаваца свінарнік, які мае пагражаць экалагічнай бяспецы на польскім баку. Намерваўся я таксама наведаць падваўкавыскую вёску, з якой паходзіць сям'я маршалка Сейма і кандыдата ў прэзідэнты Владзімежа Цімашэвіча.*

*Задбаў я аб тое, каб — у сённяшняй канфліктнай сітуацыі і некалькіх інцыдэнтах беларускіх службаў з замежнымі журналістамі — быць у парадку ва ўсіх адносінах. Паслаў я, значыць, факсам (гэтак прынята) прашэнне аб акрэдытацыю ў мінскае Міністэрства замежных спраў. Афіцыйны ліст накіравала таксама рэдакцыя „Нівы". Дзякуючы ветлівасці консула РБ у Беластоку Леаніда Каравайкі, пераслаў я прыспешаным шляхам свае фотаздымкі, неабходныя для таго, каб атрымаць акрэдытацыю. Пасля трох дзён тэлефанічна, асабіста ў Марыі Міхайлаўны Ванішынай, якая ў МЗС РБ адказвае за акрэдытацыйныя справы, пацвердзіў, што ўся мая дакументацыя ў парадку і застаецца мне толькі чакаць рашэння. Чакаў я тады ды амаль штодзень званіў, пытаўся, ці акрэдытацыю я атрымаў. Ад чарговых працаўнікоў міністэрства кожны раз чуў: „Справа яшчэ не разгледжана. Просім званіць".*

*Тэлефанаваў. Апошні раз у дзень, у які я меў выязджаць, дзень да з'езду СПБ. Яшчэ паралельна з высылкай дакументацыі ў МЗС у Мінск скантактаваўся я з тагачасным легальным старшынёй СПБ Тадэвушам Кручкоўскім. Папрасіў згоду на ўдзел у з'ездзе ў якасці назіральніка. Той сказаў: „Не я вырашаю, хто будзе запрошаны, а ўся ўправа праз тыдзень".*

*На ўсякі выпадак просьбу да Тадэвуша Кручкоўскага і ўправы адправіў я пісьмова. Не атрымаў ніякага адказу. Раней, мабыць, сакратарка, якая працуе ў Саюзе палякаў, на маё пытанне аб нумар факса, адкладышы набок трубку, запыталася ў свае сяброўкі чыста па-руску: „Танечка, Танечка, а факс у нас такой же?"*

*На самым пачатку захадаў па атрыманні акрэдытацыі паінфармаваў я аб гэтым пасла РБ у Варшаве Паўла Паўлавіча Латушку. Даў мне ён зразумець, што чакаецца яе два тыдні, але ў разе патрэбы ёсць магчымасць справу прыспешыць і адаслаў мяне да прэс-інфарматара пасольства. Пяць дзён да майго планаванага вяжу папрасіў я ў яго дапамогі. Праз гадзіну прэс-інфарматар сказаў мне: „Наша МЗС не паспявае з разгляданнем заяў на акрэдытацыю. Стараецца вельмі шмат асоб. Прашу, аднак, чакаць".*

*Чакаў я да апошняга дня, які мінаў, дарэчы, роўна два тыдні ад падачы заявы. У апошні, аднак, размове з працаўніком МЗС я даведаўся: „У нас 20 дзён на разгляд, а вы падалі заяву два тыдні таму".*

*Стала ўжо вядомым, што не паеду.*

*У дзень з'езду СПБ пазваніў мне калега з адной з беластоцкіх газет, які перасек мяжу з турыстычнай візай (без акрэдытацыі), а якога рэдакцыя ў прыхільным тоне публікавала інтэрв'ю з Тадэвушам Кручкоўскім, а пасля ў такім самым духу друкавала публікацыі аб з'ездзе і яго акалічнасцях, заклікаючы польскі ўрад да фінансавай дапамогі санкцыянаваным рэжымам Лукашэнкі ўладам саюза з Юзафам Лучнікам. Той калега пытаўся, ці пацверджу я тое, што гавораць у Гродне аб тым, што на мяжы не ўпусцілі мяне ў Беларусь. Стаў я тлумачыцца: „Уздумаў я сабе, што пры нагодзе дзяржаўна афіцыйнага з'езду Саюза палякаў Беларусі выберуся..." Da capo al fine.*

**Мацей Халадоўскі**

*— Нашы мова і культура гэта козыр, якім можам зацікавіць турыстаў. Нашы людзі выхаваліся ў беларускай культуры і хочуць, каб яна не знікла, — кажа Лукаш Плева...*

# Беларускія назвы не кусаюць

**Члены Звязу беларускай моладзі нядаўна ў вёсках распаложаных паміж Бельскам-Падляшскім і Гайнаўкай паставілі інфармацыйныя дошкі і ўказальнікі з назвамі мясцовасцей на беларускай і польскай мовах. Турыстам прапануецца заехаць у вёскі распаложаныя побач Царскага гасцінца, па якім у мінулым ездзілі рускія цары і князі на паляванні ў Белавежу. На дошках знаходзяцца легенды пра ўзнікненне мясцовасцей і звесткі пра важнейшыя гістарычныя падзеі ў наваколлі. Маладыя рашыліся паказаць мясцоваму насельніцтву, што беларускія надпісы на ўказальніках і інфармацыйных дошках будуць козырам у развіцці вёсак. Моладзь хоча зацікавіць турыстаў культурнымі адметнасцямі нашых мясцовасцей і прыгожасцю прыроды.**




Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Звяз беларускай моладзі рашыўся заняцца часткай Царскага гасцінца з Бельска-Падляшскага ў Гайнаўку*

— Я думаю, што мы першыя з ліку пражываючых у Польшчы беларусаў паставілі ўказальнікі з названнямі мясцовасцей на беларускай мове. Паказваюць яны на цікавыя месцы і чарговыя мясцовасці на Царскім гасцінцы, — заяўляе Лукаш Плева, каардынатар праекта „Мы аднаўляем царскі шлях", фінансаванага Фондам дапамогі вёсцы. — Указальнікі паставілі мы на дарожнай паласе, а інфармацыйныя дошкі — на прыватных участках. Людзі былі згодны ставіць дошкі каля іх панадворкаў, цікавіліся нашай ідэяй і памагалі закопваць стаўбы.

Рэалізатары праекта надрукавалі буклет з картай мясцовасцей побач Царскага гасцінца. Калі ў гэтых вёсках ёсць цікавыя месцы, дарогі да іх памечаны на карце, як альтэрнатыўныя шляхі. У буклеце на польскай, беларускай і англійскай мовах утрымліваецца інфармацыя пра гістарычныя падзеі ў мінулым у пасобных вёсках.

— Інфармацыйнай дошкай зацікавіліся ўжо турысты з Варшавы. Я ім жартоўна тлумачыў, што цар заехаў у Чыжыкі збіўшыся з галоўнага шляху. Раней дарогі ў нашу вёску былі настолькі дрэннымі, што нават жыдоўскім гандлярам цяжка было даехаць сюды. Аднак я думаю, што інфармацыйная дошка зацікавіць турыстаў, — гаворыць старэйшы мужчына, які на кастылях падышоў да каплічкі ў канцы Чыжык. Каля яе ўкопаны стаўбы з прыгожым дашком, а пад ім прымацавана дошка з інфармацыяй пра вёску на беларускай і польскай мовах.

— Нашы мова і культура гэта козыр, якім можам зацікавіць турыстаў. Нашы людзі выхаваліся ў беларускай культуры і хочуць, каб яна не знікла, — кажа Лукаш Плева, студэнт аддзялення турызму і адпачынку Політэхнічнага інстытута ў Беластоку. — Калі мы пісалі праект не быў яшчэ прыняты закон аб мовах нацыянальных меншасцей. Мы проста хацелі паказаць культуру беларусаў, якія тут жывуць.

Звяз беларускай моладзі рашыўся заняцца часткай Царскага гасцінца з Бельска-Падляшскага ў Гайнаўку. Арганізатары праекта не ўваходзілі ў Белавежскую пушчу, бо там знаходзіцца многа іншых турыстычных шляхоў.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Лукаш Плева*

— Хацелі мы нешта зрабіць для нашых мясцовасцей, даць штуршок для развіцця ў іх турызму. Трэба, каб вясковыя людзі зразумелі, што на турыстычнай дзейнасці можна зарабляць грошы. Турысты апошнім часам штораз больш цікавяцца жыццём на вёсках, адкрытымі сельскагаспадарчымі тэрыторыямі, — гаворыць Лукаш Плева, які пасля вучобы хоча вярнуцца на працу на Гайнаўшчыну. — Людзі здзіўляліся, што мы працуем дармова. Аднак мы думаем, што можа, дзякуючы нашай ідэі, створацца новыя агратурыстычныя кватэры.




Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Інфармацыйныя дошкі арганізатары праекта ставілі побач цэркваў і каплічак, каб больш людзей магло пазнаёміцца з іх зместам (на другім плане царква Іаана Багаслова)*

Каля каплічкі ў канцы Новага Беразова пастаўлены ўказальнікі на вёску Чыжыкі і на „Хату Сцяпана", пра якую я пісаў раней. Прыемна глядзець, калі надпісы на ўказальніках на беларускай мове і толькі знізу польскамоўны пераклад. Інфармацыйная дошка, на якой змешчаны гістарычныя звесткі пра Новае Беразова, знаходзіцца побач царквы збудаванай у гонар апостала Іаана Багаслова. Убачаць яе прыхаджане з навакольных вёсак і будуць мець нагоду пазнаёміцца з беларускамоўным тэкстам. Чарговыя дошкі знаходзяцца ў Койлах, Чыжах і іншых вёсках. На могільніку „Грабняк" і гарадзішчы „Акопы" побач Збуча, арганізатары праекта таксама рашыліся змясціць гістарычныя інфармацыі. Турыстам, што распачынаюць падарожжа з Бельска-Падляшскага, прапануецца наведаць Музей малой айчыны ў Студзіводах.

— Калі па Царскім гасцінцы праязджаў цар, людзі віталі яго вельмі ўрачыста, а на шляху збіраліся жыхары суседніх вёсак. Нельга было адзывацца ў час праезду цара і таму людзі пісалі просьбы да яго на сваім ілбе. Здаралася, што гаспадары прасілі дараваць ім больш зямлі або дрэва на будову дома, — тлумачыць Лукаш Плева, які знаёміўся з аповедамі старажылаў вёсак побач царскага шляху. — Наш турыстычны шлях мы вызначылі на падставе расказаў людзей і ён набліжаны да Царскага гасцінца. Аднак не ўсе вёскі, што апынуліся на нашым шляху, былі на галоўнай трасе Царскага гасцінца. Нават не ўсе яго фрагменты захаваліся па сённяшні дзень, бо на некаторых знаходзяцца палі і расце зараз збожжа.

Інфармацыю пра падзеі ў мінулым збіралі члены Клуба польска-беларускіх спраў, што дзейнічае ў Бельскім белліцэі, вучні Комплексу школ у Чыжах разам са сваімі настаўнікамі і гайнаўскія белліцэісты.

— Цяжка было сабраць інфармацыю з далёкага мінулага. Аднак у кожнай вёсцы, якую наведвалі вучні, былі асобы, што цікавяцца гісторыяй. Яны прыводзілі ўспаміны сваіх продкаў, — гаворыць Лукаш Плева. — Вялікую дапамогу атрымалі мы ад войтаў Чыжоўскай гміны Юрыя Васілюка і Гайнаўскай — Вольгі Рыгаровіч. Дадаткова за бюджэтныя сродкі гэтых гмін мы выканалі па дзве інфармацыйныя дошкі.

Вучні выканалі фатаграфіі вёсак, распаложаных побач царскага шляху. Яны будуць змешчаны ў Інтэрнэце на старонцы www.carskiszlak.sonca.org.

— Я думаю, што наша галоўная задума — памагчы нашаму рэгіёну — будзе рэалізавацца і ў будучыні. Нам застаецца радасць, што маглі мы рэалізаваць праект і здабылі вопыт для працы з падобнымі праектамі ў будучыні. Гэты вопыт вельмі важны для мяне асабіста, паколькі я маю намер працаваць у галіне турызму, — кажа Лукаш Плева.

**Аляксей Мароз**

## Гулянні і жахі ў Старым Ляўкове

28 жніўня (нядзеля) у амфітэатры ў Старым Ляўкове (Нараўчанская гміна) адбыўся апошні сёлетні народны фэст. Ладзілі яго гмінныя ўлады. Дзень стаяў сонечны і цёплы. На канцэрт сабраліся жыхары Старога Ляўкова і Новага Ляўкова, Лешукоў, Міхнаўкі, Ахрымоў, а нават Нараўкі. На сцэне паспяхова выступіла 7 вакальна-музычных калектываў: „Ас” з Беластока, „Дыялект” з Гайнаўкі, „Расспяваны Гарадок” і „Ріма” з Гарадка, „Цаглінкі” са Старога Ляўкова ды „Нараўчанкі” і „Кантрольны абраз” з Нараўкі. Выступленні працягваліся чатыры гадзіны. Пачуць можна было беларускія, польскія і ўкраінскія песні. Найбольш цікава было паслухаць „Аса” з Беластока, які спяваў цэлую гадзіну.

Ціхім пагодлівым вечарам і да позняй ночы да танца іграў гурт „Аксель” з Нарвы. Музыку чуваць было на 1-2 км ад сцэны. Народнае гулянне задоўжылася за поўнач.

А потым некаторыя дзяўчаты і юнакі дрэнна сябе вялі. Ідучы з забавы цераз Новае Ляўкова ў напрамку Нараўкі каля 2 гадзіны ночы голасна ўскрыквалі, гарлапанілі, брыдка лаяліся. Сваімі паводзінамі растрывожылі сабак. Даўжэй затрымліваліся там, дзе была лавачка і дзе можна было прысесці. Тут яны былі найбольш дакучлівымі. Калі нехта звярнуў ім увагу, суцішаў, тады адыходзілі. Да першай гадзіны ночы вёска спала, але каля 2-ой крыкуны разбудзілі шматлікіх навалаўкоўцаў. Былі спробы ўціхамірыць маладзёжнае шэсце. Ды дзе там. Рагаталі і брыдкасловілі асабліва... дзяўчаты. Вось які час настаў! Ішлі, свяцілі кішэннымі ліхтарыкамі ў вокны, у панадворкі. „Клас” паказалі ў пачакальні на аўтобусным прыпынку ПКС. Мабыць, ад жартаў і галосных хіхотаў дзяўчаты адбягалі ад хлопцаў і сядалі на кукішках пад плоцікам. Вяскоўцы пазванілі а гадз. 2.15 па паліцыю, але тая ў Гайнаўцы, далёка. Не прыехала, праігнаравала просьбу. Пасля трэцяй пачало святлець... (мох)

## Прыгожая гміна Нараўка

25 жніўня г.г. падчас сесіі Рады Нараўчанскай гміны (Гайнаўскі павет) падсумавалі конкурс „На пайпрыгажэйшую сялянскую сядзібу ў гміне ў 2005 годзе” і ўручылі дыпломы ды грашовыя ўзнагароды лаўрэатам.

Першае раўнапраўнае месца занялі Аліна Стульгіс з Нараўкі і Крыстына Грэсюк з Новага Ляўкова, другое — Лілля Радзіванюк са Свінарыяў і трэцяе раўнапраўнае месца — Соф’я Рубчэўская з Нараўкі і Зіна Лапінская з Плянты. Вылучэнне атрымала Барбара Бляўская з Янова. Узнагароды ўручылі войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч, старшыня Рады гміны Славамір Кулеша і старшыня конкурснай камісіі Ядвіга Карпюк. (мох)

# Мужныя Дрыгавічы



Змаганне рыцараў



Калектыў „Чыжавяне”

**III Археалагічны фэст, ладжаны 4 верасня на гарадзішчы каля Збуча, спалучаны быў з гміннымі дажынкамі і дзесяцігоддзем дзейнасці вакальнага калектыву „Збучанкі”. Дзеля дадатковых святкаванняў войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк і Гмінны асяродак культуры, якія былі арганізатарамі ўсяго мерапрыемства, наладзілі юбілейнае выступленне калектыву „Збучанкі” і конкурс на найпрыгажэйшы дажынкавы вянок. Паколькі было вельмі цёпла і сонечна, на гарадзішча прыбыло многа жыхароў Гайнаўшчыны і больш аддаленых мясцовасцей. Сабраныя цікавіліся жыццём продкаў у далёкім мінулым і змаганнямі рыцараў, у тым ліку вараў з Белавежскай пушчы.**

Дажынкі пачаліся з урачыстага шэсця з-пад Гміннай управы ў Чыжах ва Успенскую царкву, у якім прынялі ўдзел войт, члены беларускіх калектываў, жыхары гміны і запрошаныя госці. У час літургіі і малебна земляробы і госці дзякавалі Богу за сабраны плён і маліліся за дапамогу ў наступным годзе. Пасля богаслужэння былі асвечаны вельмі прыгожыя вянкі, якія выканалі беларускія калектывы Чыжоўскай гміны. Сабраныя на брычках і машынах пераехалі на гарадзішча, дзе адбылося афіцыйнае адкрыццё фэсту.

Працаўнікі гайнаўскага аддзялення Падляшскага сельскагаспадарчага дарадчага асяродка адабралі ў Чыжоўскай гміне лепшае збожжа, агародніну, фрукты і наладзілі з іх цікавую выстаўку. У рамках дажынак быў арганізаваны конкурс на самы прыгожы вянок. Пераможцам стаў калектыў „Чыжавяне”, які выканаў велізарны, прыгожа аздоблены кветкамі вянок.

— Мы рабілі вянок з сёлетняга збожжа, якое ўдалося сабраць перад выхадам камбайнаў у поле. Упрыгожвалі яго перад самымі дажынкамі і палажылі паміж збожжа фрукты і агародніну, — кажа Галена Васілюк з „Чыжавян”.

Перад публікай са жніўнымі і іншымі беларускімі песнямі выступілі калектывы Чыжоўскай гміны, „Арэшкі”, гурты з Беластока і Беларусі.

— Арганізаванне дажынак патрэбнае. Ёсць магчымасць памаліцца Богу, з людзьмі спаткацца і паразмаўляць, — кажа Яраслаў Бялькевіч з Чыжоў. — Шкада толькі, што вельмі цяжка прадаць збожжа.

— Азімае збожжа лепшае, а ярае засохла. Калі б не пайшлі дажджы, то і бульба была б вельмі мізэрнай. Аднак апошнім часам ізноў вельмі суха і цяжка араць пад азімыя пасевы, — гаворыць Ян Ахрымюк з Чыжоў.

Калектыў „Збучанкі” на свой юбілей падрыхтаваў выступленне са жніўнымі і іншымі даўнімі песнямі запісанымі ў Гайнаўскім павеце.

— Спачатку мы спатыкаліся ў Ганны Якімюк, ініцыятаркі заснавання калектыву, займаліся ручнымі работамі і спявалі. Пасля трэніровак рашыліся выступіць перад публікай. Нашы мужыкі крыху зайздросныя, але моцна не пратэстуюць супраць выездаў на канцэрты, — кажа Ніна Хворась са „Збучанак”.

— Мы думалі, што пасля дзесяці дзён разыдземся, а ўжо дзесяць гадоў праспявалі, — гаворыць Аляксандра Куптэль, якая разам з Ганнай Якімюк і Наталляй Брук былі заснавальніцамі калектыву. Зараз кіраўніком гурту з’яўляецца Кацярына Ціханюк, вядомая з сольных выступленняў. У калектыве спявае яшчэ Надзея Лабаноўская.

Для гасцей, што прыбылі з цэнтральнай Польшчы, каб пазнаёміцца з тысячагадовым гарадзішчам, беларускія калектывы засведчылі, што ў Чыжоўскай гміне жывуць беларусы. Пра іх продкаў сведчаць раскопкі праведзеныя на гарадзішчы і на старым могільніку. Дар’юш Краснадэмбскі, археолаг Інстытута археалогіі і этналогіі Польскай акадэміі навук, які вёў раскопкі на гарадзішчы побач Збуча ў мінулым годзе пераканаў, што было яно збудаванае ў IX-X стагоддзях і мабыць было старэйшым за гарадзішча ў Бельску-Падляшскім. У насыпе археолаг знайшоў людскія шкілеты з XIV-XV стагоддзяў, якія былі пахаваны паправаслаўнаму, нагамі на ўсход. Непадалёк ад гарадзішча знаходзіцца сярэднявяковы могільнік з добра захаванымі курганамі, на які можна было даехаць на брычках.

— На падставе раскопак, якія мы вялі сёлета, можна сказаць, што пахаванні на могільніку каля Збуча характэрны культуры ўсходніх славян, хутчэй за ўсё дрыгавічоў, — заявіў у час фэсту Дар’юш Краснадэмбскі.

Раскопкі на гарадзішчы, могільніку і археалагічны фэст, наладжаны ў рамках Еўрапейскіх дзён аховы культурнай спадчыны, гэта для нас вялікі прэстыж, — кажа войт Юрый Васілюк. — У нашай гміне ставім на захаванне культуры нашых продкаў і турызм. Не забываем таксама пра нашых земляробаў. Я веру, што нашы гаспадары ў больш спрыяючых умовах будуць дабівацца поспехаў на высокім еўрапейскім узроўні.

Для сабраных на гарадзішчы была падрыхтавана прэзентацыя сярэдневяковых заняткаў і рамёстваў. Каваль паказваў працу з выкарыстаннем даўніх прыладаў. Перад публікай працавалі людзі пераапранутыя за жыхароў сярэдневяковых. Аматары стральбы маглі паспрабаваць страляць з лука. На фэсце можна было ўбачыць даўнія ткацкія вырабы. Самае вялікае зацікаўленне сярод мужчын выклікала змаганне вараў апранутых у сярэдневяковую зброю. Байцы карысталіся мячамі, чаканамі, тапарамі і шчытамі дзеля прэзентацыі жорсткасці старадаўніх войнаў. Мне ўдалося паразмаўляць з варамі з Белавежы, якія назвалі сябе Васілько і Віт. Пераконвалі яны, што ўжо ад VIII стагоддзя ў Белавежскай пушчы жылі славяне. Сваю дружыну назвалі яны пастараславянску „Молнія”.

У час рыцарскіх змаганняў жанчыны цікавіліся сувенірамі, падрыхтаванымі мясцовымі вытворцамі, і народнымі стравамі, выкананымі вясковымі гаспадынямі. Прэзентацыя ваенных умеласцей перапляталася з выступленнямі беларускіх калектываў. У тым часе мужчыны кідалі хамутамі і размаўлялі пра жыццё ў мінулым. Арганізатары фэсту не забылі пра наймалодшых вяскоўцаў. Для дзетак падрыхтаваны былі разнародныя конкурсы, якія вялі сярэдневяковыя рыцары. Мерапрыемства закончылася народным гуляннем.

Тэкст і фота Аляксея Мароза

# Цыганскае соцна Карпатыі

**Джгар Эндзі Ўорхала (5)**

**Радню поп-караля ў Міковай адшукаеце з закрытымі вачыма. Шэрая мураванка, у стылі позняга Герка, найбольшая ў вёсцы, пэўна і ў наваколлі. Разам са склепам — пяць паверхаў. Іду з чорным катом (на белых лапках), які прычапіўся да мяне дзесьці каля новай царкоўкі і ўжо з гадзіну не адступае.**

**Марыю Вархолю знаходжу ў яе сціплай кухні ў падвале. Бабуля ў халаце ў кветачкі выглядае кагосьці праз акно.**

— Ніякая я ім не сваячка! — кажа з нотай крыўды і адсылае ў Медзыляборцы.

Ну — так!... калі мяне цікавіць якраз дзікая трава на панадворку ўласніка кінастудыі „Фабрыка”.

Вядома, што пасля прыезду ў Амерыку Юлія Ўорхал кожны дзень пасылала лісты сёстрам у Мікову. У сакрэце ад мужа, клала ім у канверт па адным долары. Калі Эндзі стане зарабляць мільёны ды распешчваць грашыскамі маці, тая будзе дасылаць усё большыя сумы. Яе дапамога мае шырэйшы характар — Юлія хоча інвеставаць у родны кут, перадае грошы на царкву.

Кантакт з Марыяй Вархоляй наладзім „дзякуючы” праваслаўнаму календару, які прыкмечу на цётчынай сцяне. Якраз на здымку віднее Гара Грабарка.

— А я з таго краю, — кажу, а пасля апавядаю пра нашы святыя крынічкі. Мая падляшская мова здзіўляе гаспадыню свойскасцю і заадно экзотыкай.

— А па-якому ў вас людзі святкуюць? — пытаецца.

— Па старому календару, — пераводжу на мікоўскі код.

Марыя Вархоля — сваячка па-кудзелі з Завадзкімі. Найперш расказжа мне пра свае хваробы і пра праблемы з прыбіраннем дома. Будавалі яго з думкай пра музей Эндзі Ўорхала, аднак канчаткова выйграў праект у Медзыляборцах. За апошнім настойвала частка перасваранай сям’і з Амерыкі.

— Так і зрабілі — адны другім на злосць, — уздыхае.

Папраўдзе, цётка сумуе больш за дзяцьмі і ўнукамі, што раз’ехаліся па Славакіі і Чэхіі. На стале радком выстаўлены іх паштоўкі з экзатычных экскурсій.

— А „жэбы” быў той музей у хаце, нехта з нашых са мной бы жыў...

* * *

Ужо напачатку русінскага шляху запанаваў вядомы са свойскага панадворка смутак, — смутак, што вее ад адміраючых вёсак. У Міковай, на першы погляд мураванай і заможнай, прывіталі той жа сум і дрымота. Эфект састарэласці мацаваў від гары з высечанай палоскай лесу, што нагадвала шчарбіну ад вырванага зуба. На дзікім панадворку Эндзі, дзе разам з чорна-беланогім коцікам дрыпалі мы ў пошуках нейкай падказкі, пасвіліся коні-арабы. Ад меланхалічнага трансу, які падбівалі пах лекавых зёлак, шум ручая і мяўканне, выбіў барвовы смех.

Ну-так... зноў прыкалоў аўтар „Едучы ў Бабадаг”.

Сярэдзінай вуліцы кацілася гурма цыганскіх дзяцей, з казой ды



*Марыя Вархоля*

авечкамі са званкамі. Следам гналася зграя сабак з віляючымі хвастамі. Хоць не хапала снегу, карціна нагадвала кадр з навагодніх паходаў у Гагатуху.

У біяграфіі Юліі Ўорхал ёсць таксама цыганскі матыў. Адзін год, яшчэ да замужжа, вандравала яна з цыганскім табарам і выступала як спявачка ў навакольных вёсках і мястэчках. Пасля, у Амерыцы, у сваім этна-русінска-сваяцкім крузе (за акіян з’ехалі яе дзве сястры і двух братоў ды швагер), з сястрой Марыяй спявалі па ўсіх вяселлях, хрысцінах, паховінах...

Тады на панадворку я яшчэ не ведала пра любоў Юліі і Эндзі да катоў, пра тое, што ў іх першай ньюйоркскай кватэры будзе гадавацца дваццаць адзін кот.

* * *

Яшчэ пры існаванні Чэхаславакіі ў школе ў Міковай знаходзіўся міні-музейчык Эндзі Ўорхала. На стэндах віднелі сямейныя здымкі, пісьмы з Амерыкі ды этнаграфічныя экспанаты. Пасля закрыцця школы экспанаты, па жаданні ўлад і волі часткі перасваранай сям’і (змаганне ідзе за першынство ў прамоцы спадчыны славутага сваяка), трапілі ў Медзыляборцы.

Калі мы ляжалі на дзікім панадворку і ўзіраліся ў Джгар, ззаду — значыць, па вуліцы, высвятляліся кадры родам з чэшскага фільма „Нішто нікому невядома!”

Усе турысты-веласіпедысты, што вярталіся з тамашняга музея, стралой пралятлі праз міфічную Мікову.

Пад уплывам хуткасці і рашучасці, з якой турысты ціснулі на педалі, мы дайшлі да нечаканай высновы:

— А раптам у Медзыляборцах палохаюць Дракулай!?

Бо ў свой час гэтак індывіды з кінастудыі „Фабрыка” прызывалі свайго поп-караля. Сам Эндзі належна ацаніў ролю карпацкай мянушкі ды зняў фільм *Andy Warhol’s Dracula* (1973).

Замак жахлівага Эндзі-Дракулы стаяў на гары Джгар.

*(працяг будзе)*

**Тэкст і фота Евы Сцепанюк**



*Замак жахлівага Эндзі-Дракулы стаяў на гары Джгар*

## *Чаромхаўская гміна — турызм*

Чаромха была калісь прыгарадам Кляшчэль, заснаваным, мабыць, у пачатку XVI стагоддзя. Першая згадка пра мясцовасць паходзіць з 1560 года. Чаромха моцна пацярпела ў час шведскага нашэсця, але зноў была заселена.

Зараз Чаромха мае вялікае значэнне ў якасці камунікацыйнага вузла з адгалінаваннямі чыгуначных ліній у напрамку Седльцаў, Беластока і Гайнаўкі ды шашой з Беластока ў Брэст; недалёка працуюць два пагранпераходы. Турыстычная інфраструктура гміны даволі кволая.

У Чаромхаўскай гміне няма выдатных ландшафтных і прыродных каштоўнасцей. Краявід тут мала разнастайны, плоскі. Многа тут лясоў, але большасць з іх гэта сасновыя маладнякі, насаджаныя на былых сельскагаспадарчых угоддзях. Няма ў гміне ніводнага прыроднага запаведніка, ёсць толькі невялікі фрагмент абшару ахоўваемага краявіду Белавежскай пушчы. Культурныя каштоўнасці складаюць драўляныя вясковыя забудовы Зубачоў, Чаромхі-Вёскі і Кузавы, цэрквы ў Чаромсе-Вёсцы (з 1816 года) і Зубачах (1879 г.) ды паслядворскі парк у Янцэвічах.

У Чаромсе ёсць шэсць агратурыстычных кватэр, якія прапануюць 41 начлежнае месца ды бівачны ўчастак на дваццаць месц. Ёсць чатыры невялікія бары. У Чаромсе працуе вядомы калектыў „Чарамшына”.

Праз Чаромхаўскую гміну пралягае толькі адзін веласіпедны маршрут: Кляшчэлі — Чаромха — Вулька-Тэрахоўская — Белая Страж.

У будучыні Чаромха можа стаць этапнай мясцовасцю, дзе можна будзе пачаць або завяршыць нейкі адрэзак большага турыстычнага маршрута, памечанага праз тэрыторыю гміны.

**Міхал Мінцэвіч**

## *Новы закон*

Ад 1 кастрычніка ўвойдзе ў сілу новы закон, па якому забараняецца выкідаць на сметніцу электратавары (тэлевізары, радыёпрыёмнікі, пральныя машыны, халадзільнікі, электрычныя прасы і т.п.). Непрыдатныя рэчы можна будзе здаць у краму, у якой купляем новы тэлевізар ці пральную машыну. Варта прыкмеціць, што кліенты не нясуць прытым лішніх коштаў. Уладальнікі крамаў транспартнымі ды складскімі коштамі абцяжараць вытворцаў. Так прадбачвае закон. Хто не дастасуецца да гэтых правілаў, можа быць пакараны 100-златовым штрафам. Ёсць малое „але”. Як вядома, сметніцы знаходзяцца не толькі ў гарадах, але і ў гмінах ці ў паасобных сялэтчах. Хто будзе наглядаць за парадкам? Жыццё паказвае, што непрыдатныя рэчы замест на сметніцу ці ў кантэйнер трапляюць у прыдарожныя равы ці сумежны лес. Забруджваем асяроддзе. Ці прымем у сваю свядомасць новы закон, дык час пакажа.

**Уладзімір Сідарук**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

## Вершы Віктара Шведа

### Пішу як лекар

*Адазваўся ў хаце Ваня:*
*— Ты паслухай, татка мілы,*
*Сёння мая ў класе пані*
*Мяне надта пахваліла.*

*— Чым жа можаш ты, тупіца,*
*Пахваліцца адмысловым?*
*— Я пішу як лекар, быццам,*
*З практыкаю шматгадовай.*

### Што купіць на імяніны?

*— Я купіла табе, сынок,*
*На імяніны кашалёк.*
*— Дык я, мама дарагая,*
*Грошыкаў зусім не маю.*

*— Можа я табе павінна*
*Наручны купіць гадзіннік?*
*— Я не маю, скажу з болем,*
*Часу вольнага ніколі.*

### Сябры

*— У мяне ёсць дома Мурка! —*
*Пахваліўся Юзю Юрка.*
*— А ў мяне ёсць дома Тузік, —*
*Не менш рады з сябра Юзік.*
*Мурка выбегла на ганак*
*І загаўкала на ранак,*
*Што збудзіў усіх нас зябам,*
*Холадам залез пад скабы.*
*Тузік ужо сняданак з'еў,*
*Пацягнуўся, бы той леў,*
*І замяўкаў: — Уставай, Юзік,*
*Пара ў школу. Прышый гузік,*
*Што як вечарам гуляў*
*І яго пад стол загнаў.*
*На гулянкі ёсць свой час.*
*А пара ісці ўжо ў клас!*

**Міра Лукша**



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Чацвёрты клас ПШ № 4 у Беластоку з выхавацелькай Данутай Яблонскай*

# Першы дзень у школе

На вуліцы Ліпавай у Беластоку бачу знаёмыя тварыкі дзяцей у гала-касцюмах.

— Добры дзень! — вітаюцца. Гэта навучэнцы беларускай мовы. Усе яны добра ведаюць „Зорку". Сёння таксама разам спяшаем у „чацвёрку". Пачатак года як заўсёды адбываецца на адкрытым паветры, на школьнай пляцоўцы. Паўкругам, навокал пляцоўкі, чакаюць ужо за чатырыста навучэнцаў. Многа тут нашых сяброў.

— А ў нас новая настаўніца, — заяўляе Юлітка Нікалаюк з чацвёртага класа.

Сапраўды, у чацвёртым класе вялікія змены. Па-першае, будзе многа навукі і сапраўдныя ацэнкі.

На пачатак года Лідка Пякарская надзела вышываную кашулю, а яе старэйшыя сябры з гімназіі цалкам ашарашылі мяне. Большасць з іх прыйшла ў кашульках з Пагоняй або з бел-чырвона-белым значком.

У „чацвёрцы" каля сямідзесяці дзяцей ходзіць на беларускую мову, урокі роднай мовы вядзе настаўніца Аліна Ваўранюк. Пад яе кіраўніцтвам працуюць дзве беларускія тэатральныя групы. З гэтага года ў школе будзе дзейнічаць беларускі вакальна-танцавальны ансамбль. Нашы навучэнцы атрымаюць таксама большую залу.

Новы навучальны год прывіталі таксама гімназісты. Беларуская мова выкладаецца ў Гімназіі № 7, дзе займаецца ўжо каля трыццаці асоб. У мінулым годзе нашы сябры атрымалі свой кабінет, у якім будуць вывучаць мову і праводзіць рэпетыцыі драмгурткоў, сярод якіх вядомая нашым чытачам „БАРАЦЬБА".

**Зорка**

# Маргарытка Пятэльская

Маргарытка Пятэльская жыве ў Беластоку, але і ў Меляшках. Бо ў вёсцы, адкуль родам яе мама Крысціна, а непадалёк, у Падрэчанах нарадзіўся і яе тата Юрка, намнога цікавей. Прастор, вуліца-брукаванка, па якой можна час ад часу ісці пасярэдзіне, абмінаючы толькі цёплыя каровіны сляды, зараз і поле, а за клунямі — дзве вялізныя горкі, якія хоць маюць крыху страшнаватую назву Могілкі, ды з якіх можна куляцца зімой на санках, а летам каціцца па кветках ды травах аж на загоны!.. У вёсцы шмат бабуль і дзядуляў, у якіх многа часу, і яны сядзяць на лавачках каля сваіх уквечаных агародчыкаў ды размаўляюць. Бабулі раскажуць усё, бо Маргарытка пытаецца. Мабыць, не больш і не менш чым іншыя дзеці, значыць, шмат і пра ўсё. Маргарытка чуе беларускую мову штодзень, нават у Беластоку. Усе малую галубяць — і бацькі, і сёстры, з якіх старэйшая, Марта — ужо студэнтка педагогікі ды працаўніца садка, а малодшая — Юстына, якой ужо васемнаццаць гадоў — ліцэістка, і дзядзькі ды цёткі і родныя, і чужыя. Кажуць, Маргарытка — „свойскай гадоўлі" дзяўчынка. І пэўна сустрэнемся з ёю не раз на сваіх шляхах...



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

*Маргарытка заўжды сярод сваіх*

**Міра Лукша**

# Салодкі фокус

Тамаш, пакуль раскажа сваю прыгоду, разглядаецца па баках, каб не пачулі бацькі. За такі фокус, вядома, адлупцавалі б!

— Я прыклеіў сабе вусы і бараду, апрануў дзядзькаў летнік, капялюш ды пайшоў да Марка.

Марк — найлепшы калега Тамаша. Спачатку смяяўся, пасля таксама пераапрануўся ў касцюм, прыклеіў вусы, начапіў на грудзі калькулятар. Калі хлопцы ішлі па вуліцы, дзеці кідалі ім „Добры дзень!" Значыць, палічылі іх прыезджымі.

Баба Грыпа доўга не адчыняла дзвярэй. Пасля ўзіралася на хлопцаў, нешта мармытала. Хлопцы прамаўлялі службовым тонам:

— Pani Hrypo, my z sanepidu. Musimy sprawdzić stan pani mieszkania.

— Ой, паночкі, — баранілася старэча, — няма ў мяне ніякіх сенапідаў!

— To my poszukamy!

— То прошу бардзо, — у канцы гаспадыня ўпусціла іх у хату, — шукайце, калі не верыце...

Грыпа — суседка Тамаша. Ёй дзевяноста тры гады. У вёсцы празываюць яе клептаманкай. Апошняя мянушка не ўзялася з неба. Кожны тыдзень Грыпа едзе ў „Бядронку" або ў „Яскулку". Перад касай, калі ўжо набліжаецца яе чарга, бабуля тэатральна „млее". Людзі, вядома, дапамагаюць старэнькай, выносяць яе на паветра, тэлефануюць па хуткую дапамогу...

Бабе таго і трэба. У яе сподніх кішэнях, якія спецыяльна прышыты дзеля апошняй прыгоды, заўсёды пасля такой „хваробы" знойдзеце пяць-дзесяць шакаладаў, дваццаць батонаў, пяць пакетаў пернікаў, сорак ледзяшоў. Разам з усім дабром


Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пачатак навучальнага года ў Гарадку


Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Другі клас ПШ № 4 у Беластоку з выхавацелькай Евай Мураўскай

Грыпу, як каралеву, адвозяць хуткай дапамогай у вёску. Людзі, вядома, рагочуць, калі пабачаць *карэтку*...

Тамаш мае асаблівую нагоду для радасці. Пасля візіту ў „Бядронцы" Грыпа прыносіць яму два-тры шакалады.

— Ты такі гжэчны хлопчык, — кажа.

Вядома, што ад залішняй хвальбы скрыўляецца характар. Вось і хлопцы перасталі чакаць падарункаў. Вырашылі самі пачаставацца шакаладамі.

— Мы абшукалі ўсю хату ды нічагусенька не знайшлі! — расказвае Тамаш. — Здаецца, ператрэслі ўсе куткі.

Яшчэ ў той самы дзень Грыпа наведала дом Тамаша. Яна каларытна распавядала пра дзіўных наведвальнікаў, прытым празывала іх баранамі.

— А ў вас іх не было?

— Не, — адказаў Тамаш. Папраўдзе, як агню баяўся ён гэтай сустрэчы. І зараз не ведаў — ці не кпіць з яго суседка? Бацькі не даравалі б такога фокуса. Яшчэ і да споведзі пагналі б!

— А-га! — паківала галавой баба Грыпа. — Значыць, не было ў вас тых баранчыкаў?!

— Не-не, — запыкаўся чырвоны як бурак Тамаш.

Баба Грыпа падмаргнула яму на развітанне, ды гэта не ўсё. Яна паклала на стол тры шакалады.

— Пакінулі тыя з санэпідэмстанцыі, — сказала.

У тую ноч Тамаш не мог заснуць, усё думаў пра суседку, пра яе хітрыкі і спрыт...

— Дзе яна прыхавала была тыя шакалады?..

**Зорка**

# Слонка

Колькі ж тае пералётнае птушачкі, каб яе наесціся! Чалавек здаўна палюе на птушак, а слонкі, іначай вальдшнэпы, лічыліся смачным пачастункам для багацеяў. На слонак палююць звычайна вясной, у час такавых палётаў, так званай „цягі".

Даўгадзюбая слонка (па-народнаму — сломка), з сям'і бакасавых, атрада сеўцападобных, пашырана ў Еўразіі ад Вялікабрытаніі да Хакайда, ізалявана гняздуецца ў Гімалаях, Усходнім Прыазоўі, на Каўказе, на Азорскіх, Канарскіх астравах і на Мадэйры. У нас звычайны нешматлікі пералётны ды пралётны від. Насяляе лісцевыя і мяшаныя лясы з вільготным прэлым подсцілам, з лужынамі, балацінамі, уздоўж ручаёў, балот. Корміцца слімакамі, чарвякамі, насякомымі і іх лічынкамі, якіх адшуквае ў глебе і подсціле.

Сапраўды, колькі ж таго слончынага мяска... Даўжыня яе цела — каля 35 см, маса 200-315 г. Апярэнне спіны рыжавата-бурае, з папярочным бурым малюнкам, жывот рыжавата-шэры, на цемі і на патыліцы шырокія чорныя палосы. Дзюба доўгая, ногі досыць кароткія, шэравата-ружовыя. Слонка — маўклівая, скрытная птушка. У такавым палёце ляцiць яна на ўзроўні верхавін дрэў уздоўж узлескаў і лясных дарог з крыкам *оок...оок-цсссі, цсссі* і хорканнем. Цяга пачынаецца з захадам сонца і працягвацца да змроку. Слонка — палігамная, значыць, шмат разоў засноўвае сабе пару. Гняздо будуе самка на зямлі, у выемцы каля пня, у траве, са сцёблаў травы, лісця і рознай пацярухі, яйкі складвае ў канцы красавіка. Бывае, што кладку паўтарае другі раз у год. З 4 вохрыста-белых з рыжымі і шэрымі стракацінкамі яек праз 20-24 суткі вылупліваюцца сланчаняты, якія вылятаюць з гнязда ў канцы мая. Падобна як іншыя бакасовыя, слонка можа ў выпадку небяспекі пераносіць дзіцянят у іншае месца. Адлятае ў канцы верасня і ў кастрычніку, зімуе на поўдні Еўразіі і ў Паўночнай Афрыцы.

Сапраўды, хто ж іншы, чым чалавек, можа забаўляцца „спартыўным паляваннем"! Ад іншае птушкі гэтага сямейства, бакаса, па-англійску „снайпера", так і называюць меткага стралка, які адным стрэлам можа іншую істоту пазбавіць жыцця. А птушка як абароніцца ад кулі, што ляціць хутчэй ад яе?..

**Міра Лукша**

# Польска-беларуская крыжаванка № 37

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў "Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку № 34:** Купэ, тур, верас, перапёлка, час, аснова, брама, бар. Вечар, мера, раса, этап, усё, ар, Об, кава, ганарар.

*А. Рудакоў: Ёсць у нас перасяленцы з Гродзенскай вобласці, з Брэстчыны, Гомельшчыны, ёсць перасяленцы з Віцебшчыны, з Магілёўшчыны, з Беласточчыны, нават беларусы са Смаленска і Бранска...*

# У Іркуцку — мы завадатары

**З Алегам РУДАКОВЫМ, старшынёй Таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага ў Іркуцку (Расія), які па запрашэнні нашай рэдакцыі наведаў Беласток, гутарыць Ганна Кандрацюк.**

***— Колькі беларусаў у Іркуцкай вобласці?***

— Іркуцкая вобласць займае такую тэрыторыю як Украіна, Беларусь, Прыбалтыка і яшчэ частка Фінляндыі разам, але жыхароў усяго тры мільёны. У час апошняга перапісу насельніцтва беларусамі, сведама, назвала сябе шаснаццаць тысяч чалавек.

***— Адкуль там такая вялікая грамада?***

— Большасць гэта нашчадкі перасяленцаў часоў сталыпінскай рэформы. Яны ўжо нарадзіліся як праўнукі і праправнукі і звычайна запісваюць сябе рускімі. Але ў іх ёсць гаворка, яны размаўляюць на добрай трасянцы, як у самой Беларусі.

***— З якіх яны рэгіёнаў?***

— З усіх. Ёсць у нас перасяленцы з Гродзенскай вобласці, з Брэстчыны, Гомельшчыны, ёсць перасяленцы з Віцебшчыны, з Магілёўшчыны, з Беласточчыны, нават беларусы са Смаленска і Бранска.

***— Якія ў вас арганізацыі?***

— 31 траўня 1996 года мы правялі свой першы з'езд беларусаў Іркуцкай вобласці. Зацвердзілі наш статут, сваю эмблему, — на ёй Байкал, Ян Чэрскі — наш знакаміты даследчык, які быў сасланы пасля паўстання 1863 года. Наша эмблема чытаецца так: мы жывём на тэрыторыі Прыбайкалля, але шануем традыцыі і сімвалы нашых продкаў, бел-чырвона-белы сцяг у тым ліку. І працуем на карысць Бацькаўшчыны — як рабіў гэта Ян Чэрскі.

31 траўня, кожны год, мы адзначаем свой дзень народзінаў. І калі раней мы ладзілі нейкае мерапрыемства, то цяпер мы ладзім Тыдзень беларускай культуры. Прытым кожны дзень ладзім нейкае мерапрыемства.

***— З дапамогай мастакоў з Беларусі?***

— Не, мы працуем на сваёй базе. Хто паедзе за шэсць тысяч кіламетраў у Іркуцк? У нас ёсць сем фальклорных калектываў, ёсць тры танцавальныя гурты, ёсць выканаўцы, якія сола спяваюць пад гітару ці гармонік.

***— А якая самая папулярная песня ў Іркуцку?***

— Я думаю, што „Туман ярам"! Дзе б я не бываў, у якіх вёсках — усе яе ведаюць, але спяваюць па-рознаму. Другая песня, якая падабаецца і яе ўсе спяваюць, гэта „Цячэ вада ў ярок".

***— Раскажыце пра накірункі дзейнасці вашай суполкі.***

— За дзевяць гадоў існавання суполкі ў нас шэсць афіцыйных аддзяленняў у Іркуцкай вобласці. Маем 22 накірункі дзейнасці, кожны месяц мы праводзім тры-чатыры мерапрыемствы; першы, самы галоўны наш накірунак — абрадавыя святы: Купалле, Дзяды, Гуканне вясны, Каляды, Арэшкі, Грамніцы, Пахаванне стралы...

***— Пахаванне стралы? Адкуль ведаеце такі архаічны абрад?***

— Ладзім этнаграфічныя экспедыцыі. У вёсках, дзе жывуць беларускія перасяленцы, бываюць дзіўныя рэчы, вось мы прыехалі ў вёску Марынінцы, і там запісалі ўзор беларускага танца кракавяк. У Мінску не ведалі яго. Запісваем песні і легенды, гісторыі — як яны прыехалі ў гэтую вёску.

***— Як выглядае ў вас школьніцтва?***

— У нас, на жаль, няма школы, але на сённяшні момант, у нашых аддзелах, пры школе, мы стварылі дзіцячую студыю „Ручнічок". Дзеці займаюцца вывучэннем беларускай мовы, фальклору, саломапляценнем. У Іркуцку ёсць дзіцячы клуб „Зярнятка". У асноўным там вывучаюць гісторыю беларускага народа, беларускае слова — гэта мова і літаратура, ды ўжытковае мастацтва: сэнсавая вышыўка, вырабы з саломкі. І яшчэ заняткі па фальклоры. У нас ёсць шэраг лідэраў і моладзі. Вось зараз, калі я ў вандроўцы, нашы актывісты рыхтуюцца да дзіцячага лагера на беразе ракі Ангары.

***— Як выглядае ў вас палітычны рух?***

— Палітычнага руху ў нас няма. Хоць у нашай эмблеме ёсць бел-чырвона-белы сцяг, бо мы шануем традыцыю і гісторыю, не з'яўляемся нейкай палітычнай установай. Палітыка нас раз'ядноўвае. Проста ў нас прыхільнікі ўсякіх арыентацый: адзін староннік манархіі, другі камуняка, трэці лукашыст, чацвёрты бэнээфавец. Калі пачнуць спрачацца — гэта лямант, гэта немагчыма! Таму я сказаў, што палітыкі ў нас не будзе!

І рэлігія нас таксама раз'ядноўвае: у нас шмат каталікоў, але і праваслаўных, ёсць такі як я — што Бога маюць у сваёй душы. Мы гэта называем старажытнай беларускай рэлігіяй. А што нас аб'ядноўвае: гэта мова, наш фальклор, традыцыі і абраднасць.

***— Як вас успрымаюць расіяне?***

— Іркуцк гэта шматнацыянальны рэгіён. Згодна з апошнім перапісам, у нас ёсць прадстаўнікі 117 народаў. Найбольш буйныя прадстаўнікі гэта: рускія, бураты, татары, украінцы і беларусы. Палякамі запісалася недзе каля дзвюх тысяч.

Тое, што мы з'явіліся, ужо разгледжваецца як палітычная з'ява. Бо ў нас некаторыя лічаць, што мы такія ж самыя рускія. Ну, асабліва русафілы: што вы, кажуць, тут вылучаецеся? Што, вам дрэнна жывецца ў Расіі? Вам жа ў морду не б'юць, чаго вы ўзніклі?

Ёсць такія думкі абывацельскага характару і ёсць, як я называю, бытавы шавінізм. З другога боку, калі мы арганізаваліся і назваліся імем Яна Чэрскага, пратэставала польскае таварыства „Агніва". Раней яны мелі тут дужа свой паважаны рэй, а тут раптам узнікае беларуская суполка імя Яна Чэрскага. Дык яны паднялі лямант: як гэта так, гэта ж наш паляк!? Чакайце, кажу, чаму ён ваш паляк? Гэта не так, — ён наш зямляк, нарадзіўся на тэрыторыі Беларусі, і мы маем права называцца імем нашага земляка. Я іх вызваў на дэбату ў тэлебачанні, але яны не прыйшлі. У нас ідзе такое спаборніцтва за людзей.

***— Менавіта, як выяўляеце беларусаў?***

— Я маю як індыкатар слова „бульба". Пытаю: Ну, як ты называеш картошку? Як назаве *бульба*, талкую яму, што ён наш, беларус! Па польску ж бульба — земнякі. Дарэчы, я пазнаёміўся з адным хлопцам, і ён кажа што паляк ён; мы працавалі разам і дасталі там перакуску, ён кажа *во зараз бульбачкі паедзім*. Кажу тады: ты сказаў *бульбачкі* — а ты ж паляк? Ну, цётка так называла. Ён мяне пазнаёміў з цёткай, яны ўвогуле з Гомельшчыны, толькі што яны былі католікі, у сям'і казалі „мы польскай веры". Высветлілася, што яны беларусы, што ніколі ў Польшчы не былі.

З палякамі ў нас спачатку былі такія непаразуменні, на сённяшні момант мы ладзім разам некаторыя мерапрыемствы, мы з'яўляемся ініцыятарамі, бо мы больш актыўныя. На сённяшні момант у Іркуцку ёсць толькі 47 нацыянальных культурных аб'яднанняў. І з гэтых 47-мі, найбольш актыўная, якая водзіць рэй — гэта нашая беларуская суполка.

***— Вы з перасяленцаў?***

— Не, я нарадзіўся пад Полацкам. Ёсць такая вёска невялічкая, Бяздзедавічы. Дарэчы, у нашых Бяздзедавічах ёсць такі маёнтак, які належаў сваяку Рымскага-Корсакава, музыкант прыязджаў у гэты маёнтак, і тут, як кажуць, напісаў адзін твор. Гэты маёнтак захаваўся. Я сам закончыў вайсковую вучэльню, з канца 1989 года я пачаў служыць афіцэрам. А потым, па стане здароўя, быў вымушаны вызваліцца з арміі і пачаў грамадскую справу.

***— На якой мове размаўляецце ў хаце?***

— З сынам толькі на беларускай мове.

**Гутарыла Ганна Кандрацюк**


Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК


www.terra.waw.pl

*Богаяўленская царква ў Іркуцку*

# Сакрат нам патрэбны

**У беластоцкую кавярню „Фама" рушылі тлумы. Былі маладзейшыя і старэйшыя, беларусы і палякі (беларуска- і польскамоўныя), лявіца і правіца. Усе хацелі адчуць чар і інтэлект непакорнага Сакрата Яновіча з крынкаўскай даліны, як, спасылаючыся на „Даліну Ісы" Чэслава Мілаша, акрэсліў ягоныя радзінныя Крынкі Кшыштаф Чыжэўскі, шэф сейненскага асяродка культур „Пагранічча".**

Кавярня, у якой ушаноўвалі аўтара м.інш. „Вялікага места Беластока", прыгадала цяжкі перыяд у жыцці Сакрата Яновіча, калі ў палове сямідзесятых паяўляўся тут як свайго роду „целаахоўнік", працаўнік Гарадской культурна-асветнай парадні ў час сустрэч Беластоцкіх культурных актуальнасцей і дазваляў сабе не ўпускаць без запрашэнняў нават цэнзараў.

Цяпер бенефіс пачаўся як належыцца, ад выступленняў „найважнейшых": еўрадэпутаткі, а заадно рэктара Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі ў Беластоку Барбары Кудрыцкай, падляшскага маршалка Януша Кшыжэўскага і старшыні падляшскага самаўрадавага сейміка Збігнева Кшывіцкага.

Арганізатар бенефіса і ягоны мадэратар, у гэты раз у прыцемненых акулярах, галоўны рэдактар часопіса „Карткі" Багдан Дудко, на ўзор легендарнага Пятра Скшынэцкага з кракаўскай „Піўніцы пад баранамі", спецыяльна вітаў і дзякаваў жонцы і ад гадоў добраму духу Сакрата Яновіча — Таццяне. Барбара Кудрыцкая падзялілася сваімі ўражаннямі ад знаёмства з пісьменнікам:

— Я зразумела, што жыццё перарастае легенду. Ты шмат зрабіў для крэсаў і беларусаў. Тое, што ўвесь свет ведае аб Беларусі, у гэтым таксама і Твой удзел.


Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У падарунку ўручыла юбіляру дакумент, пацвярджаючы, што ў ВШПА узнікне паслядыпломная студыя для маладых грамадзян Беларусі, якія галоўным чынам маюць вывучаць прынцыпы абавязваючыя ў дэмакратычных адкрытых дзяржавах. Сувалчанін маршалак Кшыжэўскі ў сваім пахвальным выступленні звяртаўся да героя спаткання „браце Сакраце". На тое Сакрат Яновіч зрэагаваў: „Ад уражання я ледзь не пацалаваў маршалка ў руку".

Вядомы мастак-фатограф Віктар Волкаў падараваў Сакрату Яновічу яго здымак-фотамантаж, на якім відаць юбіляра ў каралеўскім строі ды з лаўравым вянком на галаве, быццам у час Сакрата і Рымскай імперыі. Галоўны рэдактар месячніка „Часопіс" Юры Хмялеўскі, у якім Сакрат Яновіч з'яўляецца сакратаром рэдакцыі, уручыў буталь гарэлкі з наклейкай „Быць сабою". У добры настрой увёў беластоцкі пісьменнік і публіцыст Ян Камінскі складзенай песняй „Ballada marszandowskiego dziada". Дайшло таксама да своеасаблівага паяднання Сакрата Яновіча і прафесара Уладзіміра Паўлючука, якія ў апошнія гады не адзін раз выказвалі адрозныя погляды. Прафесар Паўлючук прызнаўся, што блізка 50 гадоў таму гэта не ён удзельнічаў, як працаўнік рыбалаўскай бібліятэкі, у свайго роду правакацыі, жарце, які тады не даў магчымасці Сакрату Яновічу, маладому журналісту, выехаць на прыём у мясцовы прыход. „Гэта не я, я толькі прыглядаўся", — каяўся, жартуючы, прафесар, і ўручыў шматгадоваму калегу ліловую буйную кветку часнаку, сімвал здароўя і поспеху.

Сам герой вечара ўспамінаў пражытае. Як заўжды, выяўляў шмат пачуцця гумару, таксама і на ўласны конт, хоць бы ў справе характэрнага заікання:

— На прызыўной камісіі адзін афіцэр так слухаў мяне і слухаў ды ўрэшце сказаў: „Афіцэра з цябе не будзе, бо пакуль аддасі загад, вайна кончыцца!"

Але было таксама і ўсур'ёз:

— Аказваецца, я камусьці патрэбны. Не толькі жонцы ды сям'і, але і іншым людзям, грамадству, — казаў бенефіцыент. — Жыву на злосць самому сабе. Гэта вельмі мабілізуючае пачуццё, бо шчаслівыя людзі рана ўміраюць. А я — усё бессаромна жыву.

**Мацей Халадоўскі**

# Вясельная бяседа

**— Розніцы паміж вясельнымі абрадамі Гайнаўшчыны і Пружаншчыны вельмі малыя і тычацца толькі дэталяў. Яшчэ да пяцідзесятых гадоў у наваколлі Пружан можна было спаткаць хлопцаў, што ішлі вянчацца ў вышытых кашулях і жанчын, якія апраналі народную вопратку. Пасля маладыя памянялі іх на касцюмы і белыя сукенкі, — сказаў Васіль Пілюцік, кіраўнік Тэатра танца „Ойра" з Пружан. Прыехаў з імі Фальклорны гурт „Бабіна лета" з Аранчыц Пружанскага раёна.**

У вясельнай бяседзе, якую 28 жніўня ў гайнаўскім амфітэатры наладзілі Гайнаўскі дом культуры і Галоўнае праўленне БГКТ, прынялі ўдзел калектывы з Беласточчыны і Беларусі. Арганізатары мерапрыемства рашыліся дакладна паказаць старадаўні вясельны абрад на Беласточчыне. Пружанскія ўдзельнікі бяседы заўважылі, што іх вясельны абрад вельмі мала розніўся ад прэзентаванага на сцэне. Крыху іншыя вясельныя звычаі бывалі на Міншчыне, адкуль спевакі таксама прыехалі ў Гайнаўку.

Паўгадзіны да планаванага адкрыцця мерапрыемства ў амфітэатры ішлі яшчэ рэпетыцыі. Спевакі беластоцкіх, бельскіх і гайнаўскіх беларускіх калектываў, „Тыневічанкі" і госці з Беларусі тры дні супольна трэніраваліся, каб згодна з заўвагамі старэйшых асоб і фальклarыстаў паказаць вясельны абрад. Пасля афіцыйнага адкрыцця бяседы, якое зрабілі дырэктар ГДК Андрэй Скепка, старшыня БГКТ Ян Сычэўскі і бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк, на сцэну выйшлі акцёры. Галоўныя вясельныя ролі выпалі жыхарам Беласточчыны. Калектывы з Беларусі найчасцей выступалі ад імя гасцей. Паказалі яны свае вакальныя і танцавальныя ўмеласці, а ў размове высветлілася, што некаторыя вельмі добра ведаюць ход вясельных абрадаў.


Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Маладая пара вярнулася з царквы пяшком*

— Харчаванне на вяселлях было ў мінулым смачным. Давалі госцям сушаныя каўбасы, вараное мяса, агуркі, памідоры і іншую агародніну, — гаварыў Ян Гвоздзік з Пружан.

Вясельныя сцэнкі ставіліся калектывамі з Беласточчыны ў час агляду самадзейнасці і таму акцёры на сцэне вялі сябе ўмела. Аднак гайнаўская вясельная бяседа была асаблівай. Ад калектываў патрабавалася паказаць усе абрадавыя дэталі і таму мерапрыемства было даволі доўгім. Публіку знаёмілі з народнымі спевамі, прымаўкамі і танцамі.

— На Міншчыне вясельны абрад крыху розніўся ад вяселляў, што ладзіліся на Беласточчыне. Выкуп маладой адбываўся ў дзень вяселля. Жаніх расплачваўся цукеркамі і іншымі падарункамі, а пасля маладыя супольна ехалі ў царкву. Перад вянчаннем сабраныя не гасцявалі. У кухні частавалі толькі сваякоў, што прыбылі з далёкай дарогі, — расказвала Альжбета Пятроўская, кіраўнік Народнага фальклорнага гурту „Гасцінец" з Ракава Мінскай вобласці.

У час мерапрыемства пашанцавала з надвор'ем і вялікі гарадскі амфітэатр запоўніўся. Старэйшыя жыхары ў думках успаміналі вяселлі, якія адбываліся ў іх маладосці. Шкадуюць яны, што зараз забываюцца даўнія вясельныя абрады. Апошнім часам сталі масава ўводзіць абрады, замацаваныя ў польскай традыцыі, як хаця б „oczepiny". Публіка забаўляецца непрыстойнымі гульнямі, а моладзь можа думаць, што так гулялі іх продкі.

— Зараз вясельнікі пачалі гасцяваць у „кнайпах" і занікае самая вялікая прыгажосць вяселляў. Раней было многа перажыванняў, а зараз вяселле зводзіцца да гасціны, — заявіла Люба Гаўрылюк, якая часта выходзіла на сцэну.

Вясельная бяседа закончылася народнымі танцамі. Моладзь мела добрую нагоду пазнаёміцца з беларускім вясельным абрадам. Можа нейкі хлопец захоча вянчацца ў народнай кашулі або дзяўчына рашыцца паехаць у царкву ў сукенцы з закрытымі плячамі.

— Цяпер на Міншчыне пайшла мода на вяртанне даўніх вясельных абрадаў. Дзеля гэтага арганізатары вяселля наймаюць народны гурт, які знаёміць гасцей са старымі абрадамі, — сказала Альжбета Пятроўская.

**Аляксей Мароз**

*Людзі не толькі слухаюць сваіх улюбёных выканаўцаў, але і сочаць за іх прыватным жыццём, параўноўваюць колішнія іх песні з апошнімі і складаюць рэйтынгі...*

# http://music.fromby.net

Пэўна няма ў свеце чалавека, які б не любіў паслухаць музыку і песні. Таму музычны шоу-бізнес адзін з найбольш прыбытковых заняткаў у свеце. Людзі не толькі слухаюць сваіх улюбёных выканаўцаў, але і сочаць за іх прыватным жыццём, параўноўваюць колішнія іх песні з апошнімі і складаюць своеасаблівыя рэйтынгі найбольш папулярных мелодый, якія завуць гітамі. Аб беларускіх гітах, якія прадстаўляе сайт „Тузін гітоў". Беларускі музычны гіт-парад" мы сёння і пагаворым.

Каб зайсці на „гітовы" сайт, трэба набраць у Інтэрнэце адрас: http://music.fromby.net. Перад намі адразу адкрыецца не вельмі ярка аздобленая, але даволі цікавая віртуальная старонка з інфармацыяй аб найбольш папулярных сучасных беларускіх песнях і іх выканаўцах. Сціпласць афармлення першай старонкі можна растлумачыць яе строгасцю.

Уверсе з левага боку назва сайта і лічба „12". Пад ёй значная колькасць выйсцяў да іншых рубрык сайта. Першая ж старонка называецца „Гіт-парад". Тут разам з фотаздымкамі падаецца інфармацыя пра таго ці іншага выканаўцу. Зразумела, вялікім паведамленням не змясціцца на адной старонцы, таму, каб падрабязней азнаёміцца з інфармацыяй, трэба клікнуць на стрэлачкі, якія маюцца пры кожнай нататцы. Найбольшую цікавасць на гэтай старонцы выклікае табліца гіт-параду. Там змешчаны пералік найбольш папулярных песень, згодна іх прывабнасці для слухачоў.

Наступная рубрыка — „Музычныя навіны". Вартасць яе не зусім зразумелая, бо многія з тых паведамленняў, што знаходзяцца на першай старонцы, паўтараюцца тут. Тое ж самае адносіцца і да наступных „Навінаў гіт-параду". Магчыма, распрацоўшчыкі сайта такім чынам хацелі на ідучых далей старонках рассартаваць тое, з чым віртуальныя наведвальнікі пазнаёміліся на пачатку свайго азнаямлення з сайтам. Шчыра кажучы, не зусім зразумелае жаданне.

На жаль, наступная рубрыка, якая магла б прынесці сайту большую папулярнасць, не працуе. А называецца яна „CD.крама". Вельмі шкада, тым больш, як паведамляецца на старонцы „Пра праект", гэты медыйны праект пачаў працаваць ажно ў кастрычніку 2003 года.

Старонка „Архіў гіт-параду" дазваляе найбольш апантаным меламанам прасачыць за ўзлётамі і падзеннямі папулярнасці тых ці іншых музычных кампазіцый. Да гонару распрацоўшчыкаў сайта, архіў змяшчае інфармацыю з самага пачатку працы праекта.

Невялікай, але даволі цікавай з пункту гледжання заўзятараў беларускага рок-н-рола можна назваць рубрыку „Заля славы". Тут мы можам даведацца пра некаторыя творчыя калектывы, якія, па меркаванню натхняльнікаў „Тузіна гітоў", вартыя асаблівай увагі і павагі. Да іх належаць „Уліс", „Мясцовы час", „Мроя", „Бонда", „Сузор'е" і „Песняры".

Тым, хто хоча не толькі цэлы час чуць мілыя сэрцу спевы, але і стала бачыць твары спевакоў, вельмі карысная будзе старонка „Фотакроніка". Там змешчана мноства фотаздымкаў некаторых выканаўцаў у розных ракурсах і пры розным асвятленні.

Ну а для тых, хто больш сур'ёзна ставіцца да сучаснай беларускай музычнай культуры, сайт утрымлівае рубрыку „Рэцэнзіі". Згодна правілам музычнай крытыкі да кожнай плыты, выява якой падаецца на гэтай старонцы, дадаецца змястоўная інфармацыя аб песнях, што нам прапануюць паслухаць спевакі і аб цяперашніх справах саміх спевакоў.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Дзявочая баскетбольная дружына пад кіраваннем Анатоля Ваўлева стала юніёрскім чэмпіёнам кантынента ў першай лізе, заваяваўшы пуцёўку ў вышэйшы дывізіён...*

# Беларусь, беларусы...

## „Дажынкі" жніўня

Галоўны спартовы форум года — чэмпіянат па лёгкай атлетыцы ў Хельсінкі і поспехі на ім беларусаў не пакінулі альтэрнатывы ў выбары лепшых спартоўцаў краіны мінулага месяца. Вызначэнне мацнейшых квінтэтаў жніўня было як ніколі простым. Што датычыць намінацыі „каманды месяца", то тут было складаней. Дзявочая баскетбольная дружына пад кіраваннем Анатоля Ваўлева стала юніёрскім чэмпіёнам кантынента ў першай лізе, заваяваўшы пуцёўку ў вышэйшы дывізіён. А каманда весляроў спярша стала чэмпіёнам кантынента ў байдарцы-чацвёрцы ў водным спрынце на 500 м, а потым была першай і на чэмпіянаце свету. Але гэтыя дасягненні адышлі на другі план перад выступам жаночага спрынтэрскага квартэта ў Фінляндыі. Юлія Несцярэнка, Алена Неўмяржыцкая, Наталля Салагуб і Аксана Драгун здзейснілі „подзвіг", усталяваўшы новы нацыянальны рэкорд і стаўшы самай рэактыўнай белай камандай свету.

1. **Іван Ціхан** (кіданне молата) стаў двухразовым чэмпіёнам планеты і паказаў другі вынік у гісторыі „шпурляння" жалезнага снарада. Зроблена суперважкая заяўка на лепшага спартоўца года Беларусі.

2. **Вадзім Дзевятоўскі** (кіданне молата) склаў належную канкурэнцыю суайчынніку і быў недасягальным у бягучым сезоне для астатніх асілкаў свету.

3. **Аляксандр Жукоўскі** (веславанне) узяў бронзу на чэмпіянаце Еўропы, што прайшоў у Познані. Прадстаўнік Бабруйска стаў трэцім у адзіночным каноэ на кіламетровай дыстанцыі.

4. **Максім Мірны** (тэніс) разам са шведам Юнасам Б'ёркманам выйграў чарговы парны турнір серыі „Мастэрс". Цяпер у амерыканскім горадзе Цынцынаты. Гэта ўжо трэці поспех зладжанага дуэта ў сезоне. Пасля такой перамогі, хлопцы зноў вярнулі сабе першы рэйтынг у парнай класіфікацыі. У гэтыя дні яны вядуць спабор на чэмпіянаце ЗША — апошнім турніры „Вялікага шлема" ў бягучым годзе.

5. **Сяргей Мартынаў** (кулявая стральба) у фінале Кубка свету ў Мюнхене здабыў срэбра. У практыкаванні з малакаліберной вінтоўкі беларус па выніках кваліфікацыі лідзіраваў, паўтарыўшы абсалютны сусветны рэкорд (600 балаў з 600 мажлівых!), у выніку ж наш алімпійскі лаўрэат стаў другім.

1. **Надзея Астапчук** (штурханне ядра) не мела сабе роўных у Хельсінкі. Цяжка і ўзгадаць, калі штурхальніцы чатырохкілаграмовага ядра перамагалі з такім запасам.

2. **Маргарыта Турава** (спартовая хада) выбілася на п'едэстал на дыстанцыі 20 км. Каб арбітры былі больш прынцыповымі адносна стылю хады пераможцы — расіянкі Івановай, то наша Рыта магла быць і першай.

3. **Святлана Хахлова** (плаванне) пасля ад'езду Алены Попчанкі і Ганны Шчэрбы за мяжу выйшла ў прымы айчыннага басейна. У жніўні Святлана была шостай на чэмпіянаце свету на дыстанцыі 50 м вольным стылем, а пасля заваявала на універсіядзе срэбра і бронзу.

4. **Вольга Краўцова** (бег) двойчы перапісвала нацыянальны рэкорд на адвечна „афрыканскай" дыстанцыі 10 кіламетраў, выявіўшы значны „рост".

5. **Юлія Несцярэнка** (бег) зрабіла значны ўнёсак у заваёву эстафетнай бронзы, а ў індывідуальным спрынтэрскім забегу была восьмай. Спакваля „белая маланка" падвышае свае вынікі, так на паслячэмпіянатным жнівеньскім этапе „Залатой лігі" яна заняла ўжо высокае 4-е месца.

**Уладзімір Хільмановіч**

# І пачаўся новы год!

Пачатак школьнага года ў бельскай „тройцы" пачаўся традыцыйна ў амфітэатры, побач школы. Ужо 15 мінут перад дзевятай гадзінай пры школе і ў парку гуртаваліся вучні, якія расказвалі пра мінулыя канікулы, летнія падарожжы. Воклічам радасці ад спатканняў не было канца. Можна было сярод малалетак заўважыць радасць, бо, як сказала мне вучаніца IV класа Аляксандра Семянюк, „мы ўжо на год старэйшыя!"

Інаўгурацыя школьнага года пачалася з дзяржаўнага гімна, які найбольш перажывалі наймалодшыя школьнікі. То на іх тварыках адлюстроўваліся страх перад чымсьці новым, нязведаным і гордасць першакласнікаў. Не ў адных бацькоўскіх вачах паявіліся слёзы, калі дырэктар школы Васіль Ляшчынскі папрасіў старшакласнікаў цёпла прывітаць новых вучняў, а громкія апладысменты загучалі як шчырае сяброўскае „вітайце!".

Бельская Падстовавая школа № 3, паводле слоў дырэктара, з'яўляецца „школай без ніякіх межаў, дастунпай для ўсіх". Гэта праўда, бо яна прымае дзяцей з усіх кварталаў горада. У гэтым годзе ў падставовай школе і гімназіі працуюць 33 аддзелы, на тры менш чым у папярэднім годзе. У „тройцы" навуку пачало 869 вучняў (547 у пачатковай школе і 322 у гімназіі). Вучнямі займацца будзе 81 настаўнік, у тым ліку два новыя педагогі: Пятро Стасюк — настаўнік фізкультуры і Галена Мешчаракоў — настаўніца рускай мовы, якую на просьбу бацькоў школа ўвяла ў сваю праграму.

Школа, выходзячы насупраць патрэб вучняў і бацькоў, арганізуе пазаўрочныя заняткі — спартыўныя, навуковыя, вакальныя, мастацкія, каб цікава запоўніць вольны час. Вучні маюць у чым выбіраць.

Адказваючы на пытанне што школа робіць, каб быць атракцыйнай так для вучняў, як і для бацькоў, дырэктар Васіль Ляшчынскі сказаў: „Папершае, гэта добрая навука і апека. Хаця наша школа вялікая, стараемся запэўніць асабісты кантакт паміж настаўнікамі, дзяцьмі і бацькамі, ствараючы сямейныя адносіны, без атмасферы страху і пры вялікім даверы. Дзеці і бацькі не павінны адчуваць сябе чужымі ў нас, павінны адкрыта і без страху гаварыць аб сваіх праблемах, бо калі аддаюць нам пад апеку тое, што для іх найдаражэйшае — сваіх дзяцей, чакаюць ад нас не толькі прафесіяналізму, але і бацькоўскай цярплівасці і развагі. На працягу пяці гадоў вынікі гімназічных экзаменаў у нас вышэйшыя чым сярэдняя не толькі ў павеце, ці ваяводстве, але і ў Польшчы — а гэта доказ узроўню, які прадстаўляюць нашы выпускнікі".

Фота Паўліны Шафран-Асташэвіч



Бельскую „тройку" часта называюць беларускай. Школа карыстаецца даверам бацькоў, якія ахвотна пасылаюць туды сваіх дзяцей. „Беларуская мова ў нашай школе, — гаворыць дырэктар Ляшчынскі, — жывая. Яна атракцыйная тады, калі будзе выкарыстоўвацца ў штодзённым жыцці, а гэта мае месца ў нашых гуртах, дзе дзеці спяваюць на беларускай мове, гуляюць беларускія танцы. Бракуе нам аднак дзіцячых часопісаў. Хаця ў „Ніве" друкуецца „Зорка", але графічна не з'яўляецца яна цікавай для наймалодшых, якія ахвотней выбіраюць каляровую прэсу. Патрабуем таксама такіх энтузіястаў як Дарафей Фіёнік, якія сваёй любоўю да роднай зямлі, да ўсяго што беларускае, нашае, заражваюць моладзь".

Пачатак школы гэта таксама час вялікіх выдаткаў для бацькоў. Бывае так, што хатняга бюджэту не хапае на неабходныя пакупкі, якія часам перавышаюць 700 зл. Апрача падручнікаў, даходзяць сшыткі, навуковыя дапаможнікі, спартыўныя строі. Але гэта справа бацькоў, якая не павінна паўплываць на настрої вучняў, якія радуюцца пачатку новага школьнага года.

**Паўліна Шафран-Асташэвіч**

*Царква ў Сабятыне налічвае звыш трохсот гадоў. А перад ёю стаіць крыж, які мае сумную гісторыю. Калі набліжалася адмена прыгону, адзін мужык вельмі радаваўся новым перспектывам, агітаваў за новым парадкам. Тады яго злавілі землеўладальнікі і павесілі на дрэва...*

# У дачным напрамку

**Сабятына (гміна Мілейчычы) з першага позірку здаецца быць вёскай дачнай будучыні. Рэдкія дамы тут задбаныя, панадворкі больш панскія чым мужыцкія. З агарода выходзіць пажылая жанчына з традыцыйна плеценым кошыкам, у кошыку крыху невялікай морквы з прарыву. Гутарыць са мною вытанчанай польскай фанетыкай, карэктна, але з нейкай насцярогай — мабыць не таму, што я там чужы, але таму, што загаварыў на мове, на якой ёй гаварыць не хочацца.**

На вуліцу заехала мабільная крама; клаксан склікае малалікіх пакупніц, якія нетаропка падыходзяць да самахода. Далей іду загуменнем, да солтыса, які жыве за вёскай. Салтысоўства няма дома, выехала ў Мілейчычы.

Вяртаюся на вуліцу. Крама яшчэ не абагнала мяне, яшчэ далекавата, але ўжо крыху людзей чакае яе. Прашу дазволу прысесці на адну лаўку. Сядзеўшая на ёй жанчына склікае суседзяў, па-тутэйшаму, маўляў, будзе пра іх у радыё. Абвяргаю гэтыя спадзяванні, але ўсё ж такі людзі рады, што нехта да іх заглянуў. Крыху наракаюць мне, што мала хто звонку цікавіцца іхняй вёскай.

Мае суразмоўцы пажылыя. Усе ўжо аўдавелі, пахварэлі на нейкія хваробы. Але пагодліва ставяцца да тых абставін, у якіх апынуліся. Мужчына просіць мяне падшукаць яму жонку — ціхую, працавітую і каб была з чыстымі нагамі. Суседкі ў гэтым кантэксце згадваюць яму пра сябе, але ён хоча чужую. Мае суразмоўцы крыху з сабою чубяцца, я нават пачынаю крыху апасацца далейшых падзей, але яны супакойваюць мяне, што яны так сабе ўзбагачаюць вясковае бытаванне.

Адна з жанчын у папярэдні дзень перасыпала авёс, некалькі цэнтнераў мінулагодняга — у збожжавыя склады яго не прынялі. І сёлета збожжа стаіць на пні ў полі, і яго невядома куды будзе дзець. Іншая жанчына радуецца сваёй сялянскай пенсіяй — пяць мільёнаў; сёння гэта толькі пяцьсот злотаў, з якіх яна выгаспадароўвае пакрысе сунуць унукам...

Набліжаецца мабільная крама, а я пакідаю сваіх сімпатычных суразмоўцаў. Іду глянуць на царкву, што на тамашніх могілках, у якую кожную трэцюю нядзелю прыязджае правіць малебен святар з Сасін. Царкоўка прыгожа гарманіруе з сасновым атачэннем могілак.

У Сабятыне працуе і сталая крама, у якой, як і ў вёсцы, таксама нетаропкі рух. Недалёка за крамай арыгінальная хата, дагледжаная, накрытая цалкам саламянай страхой. Яе адметнасць падмацавана яшчэ і тым, што ейная ўладальніца адганяе ад яе ахвотных пракруціць на плёнку гэты помнік колішняй мясцовай архітэктуры. Праходжу далей не рызыкуючы канфлікту з арыгінальнай жанчынай.


Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Крыж з пакутным мінулым абаперся на соснах

Заходжу ў хату Андрэя Коцыка, рэкамендаванага мне вяскоўцамі старажыла, знаўцу мясцовай гісторыі. Да мяне ў ягоную хату завітала тое няшчасце, якое наведвае пажылых людзей — захварэла ягоная жонка і апынулася ў сямятыцкім шпіталі. Гаспадар чакае сына, з якім паедуць наведаць хворую. На некалькі хвілін адрываю гаспадара ад нясветлых думак...

Вось згаданая раней царква ў Сабятыне налічвае звыш трохсот гадоў. А перад ёю стаіць крыж, які мае сумную гісторыю. Калі набліжалася адмена прыгону, адзін мужык вельмі радаваўся новым перспектывам, агітаваў за новым парадкам. Тады яго злавілі землеўладальнікі і павесілі на дрэва. Калі прыгон быў адменены, тады сяляне зрэзалі тое дрэва і з яго вычасалі крыж, які паставілі на могілках. Камель крыжа спарахнеў і яго абаперлі аб высокія сосны.

Спадар Коцык цікавасці да мінуўшчыны набраў ад свайго дзеда, які каліська-каліська браў яго на калені і расказваў шмат пра колішнія падзеі. І ён сам многа бачыў за свае восемдзесят пяць. Асабліва жахлівую другую сусветную вайну, калі мясцовае насельніцтва зманьвалі недальнавідныя маякі. Сем вяскоўцаў, якія зашчыравалі ў савецкі час раскулачваючы суседзяў, у нямецкі час расплаціліся найвышэйшай цаной...

Выходжу за вёску, між залацістыя нівы. Гаспадары збяруць ураджай, які цяжка будзе прадаць. Гэта пра зерне. Пад лесам бачу валок спрасаваных старых валкоў саломы. І салому некуды дзець. Не ўжываюць яе для крыцця стрэх, бо і стрэх — нават крытых сучаснымі дахавымі матэрыяламі — на вёсцы ўсё менш. Вясковая вытворчасць становіцца лішняй, непатрэбнай. І вёскі быццам выходзяць насустрач гэтай тэндэнцыі, згортваюцца да дачных пунктаў на карце.

**Аляксандр Вярбіцкі**

# Іерархі-віноўнікі

*У „Ніве” н-р 33 ад 14 жніўня г.г. прачытаў я артыкул Сцяпана Вішнеўскага з Гайнаўкі п.з. „Адстойваць беларускасць у Царкве” і сур’ёзна над ім задумаўся. Аўтар піша, што назіраецца ў нашых цэрквах паланізацыя, уводзіцца чытанне Евангелля і пропаведзей на польскай мове. Трэба сказаць тут праўду, што набажэнствы ў нашых цэрквах павінны служыцца на старажытнацаркоўнаславянскай мове, а пропаведзі могуць быць на гаворцы прыхаджан. Мне аднойчы прыйшлося гутарыць з адным святаром (імя і прозвішча якога я не выяўляю), каб ён адпраўляў набажэнствы ў царкве на беларускай літаратурнай мове. Тады святар сказаў: „Няхай для мяне надрукуюць кніжкі на беларускай мове, тады я буду так маліцца”. За тое, што ўводзіцца польская мова ў некаторых цэрквах, трэба абвінавачваць толькі іерархаў нашай Праваслаўнай царквы на чале з мітрапалітам Варшаўскім і ўсяе Польшчы Савам, бо ён з’яўляецца адказным за Праваслаўную царкву ў нашай дзяржаве.*

*Што тычыцца нападзення дзяржаўнага кантрольнага органу на Праграмную раду тыднёвіка „Ніва”, дык гэта, па-мойму, сталінскі метад знішчэння этнічных меншацей у Польшчы — „Дайце мне чалавека, а я ўжо знайду на яго параграф”. Першым ворагам „Нівы” стаў „Кур’ер паранны”, які кляйміў журналістаў „Нівы” абзываючы іх сталінскімі прыслужнікамі ды камуністамі. Потым Найвышэйшая кантрольная палата, праводзячы некалькімесячны кантроль, падала заяву ў Пракуратуру аб незаконна выдаткаванай рэдакцыяй „Нівы” дзяржаўнай датацыі. Пракурор спачатку пагразіў старшыні Праграмнай рады да васьмі гадоў турэмнага пакарання. На маю думку, усё гэта адбывалася пад дыктоўку вышэйшай улады, якая спусціла з ланцуга „эльзаскую аўчарку”, каб яна пакусала нацыянальныя меншасці — спачатку беларускую, бо яна з’яўляецца колькасна найбольшай, а потым іншыя меншасці. Але ні Праграмная рада, ні рэдакцыя „Нівы” не спужаліся пракурора, а толькі абстойвалі сваю нявіннасць. І цяпер пракурор ужо не пагражае васьмігадовым пакараннем, а просіць пакаяння аб сваёй віне, тады ён адступіць ад пакарання. Гэтыя дзеянні праходзілі перад тым, як рэжым прэзідэнта Лукашэнкі пачаў дрэнна ставіцца да польскай меншасці ў Беларусі. Тады ні ўлады Беларусі, ні польская меншасць словам не заікнуліся, што дыскрымінуюць беларусаў у Польшчы. Гэта значыць, калі нас крыўдзяць, а пракурор знойдзе на нас параграф — усе маўчаць, а калі Лукашэнкаўскі рэжым дыскрымінуе палякаў на Беларусі — мы мусім заступацца за тымі нявіннымі людзьмі, толькі за намі няма каму заступіцца. Чаму няма каму пакараць журналістаў „Кур’ера паранняга”, якія ўжо ад некалькіх гадоў пішуць няпраўду аб „Ніве”? Пракурор гэтым не будзе займацца, бо скажа, што гэта малая грамадская шкоднасць, а мы, беларусы, вытрымаем усё, хоць з’яўляемся польскімі грамадзянамі толькі праваслаўнага веравызнання.*

***Мікалай Лук’янюк***

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 003 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2005 r. upływa 5 września 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# Горамурашкі

*Галачка паехала ў Гродна другі раз. Намовіла яе вечная мурашка з-пад Кузніцы, якая зубы з'ела на гандлі гарэлкай і цыгарэтамі, Люцынка. Тая Люцынка была ўжо як сапраўдная мурашка — парудзелая ад дыму і рынкавага сонца ды ветру. Вядома, праца на свежым паветры кансервуе-марынуе працаўнікоў, і свой сваёго пазнае. Люцынка перайшла ў апошні час толькі на перавоз „гаручага", здавала тавар найчасцей адразу ў Кузніцы. Мытнікі і пагранічнікі добра ведалі ў твар усіх мурашак, якія „абарочвалі" цераз мяжу некалькі раз у дзень. Спатрэбіўся б новы твар ездзіць па тавар. І Люцынка намовіла спакойную бландзінку з-пад Саколкі, Галу, беспрацоўную, раз-другі з'ездзіць па гарэлку. У Гродне паначапляла на знаёмую торбачак са спіртам дзе было можна. Пад плашчом не было відаць — круглатварая Галачка была неспадзеўна худзенькая, дык абвілі яе ад шыі аж да кален спіртнымі кілбаскамі. Удалося прашмыгнуцца праз кантроль. Усё ў Галачкі ў торбе было як паложана — буталь гарэлкі ды дзесяць пачак цыгарэт „Марлбора".*

*У цягніку, праўда, Галачцы было не вельмі выгадна. Выйшла ў тамбур, падыхаць. У калатнечы, калі незнаёмыя ёй спецыялісты пачалі бегаць ды хаваць свой тавар, напароўся на яе жылісты кантрабандыст. Забыўшыся нават на сваю кантрабанду, загледзеўся ў мілавідны твар незнаёмкі. Запрапанаваў прыкурыць. Жарынка ад яго папяросы ўпала на грудзі свежай кантрабандысткі...*

*Галачка запалала сінім полымем. Торбачкі са спіртам узрываліся адна за адной. Ніхто не змог сцягнуць з кабеты адзення, якое ад полымя маланкава скурчылася і спалымнела разам са скурай, на паверхні цела ствараючы згарэлую шкарлупіну. Скорая прыехала хутка ды павезла непрытомную абгарэлую ледзь не ў ста працэнтах пацыентку ў Саколку. Лекар быў упэўнены, што вязуць труп.*

*У бальніцы аказалася, што ва ўчарнелым, з голым мясам целе няшчасной „кантрабандысткі" яшчэ тлее дух. Не мелі нават за што класці яе на койку ў рэаніманыі. На кульшы было відаць косць. Лыткі былі як увэнджаны купмяк... Паколькі з Галай пагарэлі яе дакументы, праляжала пару дзён у сакольскім шпіталі, пакуль не знайшла яе там пляменніца. Маладая бізнесменка Маргарыта пакінула свае інтарэсы на мужа, занялася сваячкай. Сказалі ёй адразу, што не павінна мець надзеі на тое, што сваячка выжыве. Адно што маглі памагчы — праз крапельніцу ўпускаць наркотык, каб не скавытала ад болю. Немагчыма было нават яе голае цела перакласці з прасціны на прасціну — тыя прыліпалі да жывога цела, з ізалятара нёсся гнілы пах папсаванага мяса. Медсёстры нават за вялікія грошы не хацелі сядзець пры хворай, дык Маргарыта адна займалася сваячкай. Знайшліся таксама лякарствы, якія мацней абязбольвалі, так, што пацыентка непрытомнела і спала. Урэшце ўдалося сваячцы перавезці хворую цётку ў Беласток, дзе лекары з большай надзеяй узяліся за лекаванне ўжо памазанай на апошнюю дарогу непрытомнай Галіны.*

*Надзеі не мела і сама Маргарыта, хоць упарта тлумачыла сваячцы: устанеш, будзеш хадзіць, на тваіх кульшах адрастуць цягліцы, вырасце на табе новая скура і будзеш як чалавек. Ёй самой патрэбна была ўжо падтрымка — найбольш абнадзейваў яе сын, які вучыцца ў семінарыі на святара. Рафал быў поўны веры ў тое, што Бог не дасць прапасці. Якраз Ён дае жыццё, казаў, і толькі Ён можа памагчы, каму пісана жыццё. А дае ён і помыслы лекарам, фармацэўтам, лабараторыям, каб ратаваць жыццё. І Гала ўстала.*

Міра Лукша



Фота Адрыяна Крушка

*Познань разам з Варшавай, Вроцлавам і Беластокам стаўся адным з гарадоў, якія ўвайшлі ў польскую трасу „Н.Р.М."...*

# Канцэрт „Н.Р.М." у Познані

3 верасня ў Познані адбыўся канцэрт гурту „Н.Р.М.". Разам з Варшавай, Вроцлавам і Беластокам Познань стаўся адным з гарадоў, якія ўвайшлі ў польскую трасу гурту. Музыкі зайгралі на адкрытай пляцоўцы на Лэнгах Дэмбінскіх, месцы цесна звязаным з дзейнасцю „Салідарнасці". Канцэрт быў прымеркаваны да 25 гадавіны паўстання незалежнага прафсаюза і пачатку супрацьстаяння савецкай дыктатуры. Побач з „Н.Р.М." на сцэну выходзілі іхныя польскія сябры „Страхі на Ляхі", познаньскія рэпэры з „Мэза", украінскія рэвалюцыянеры з „Greenjoly" і забаронены ў часы камунізму „Манам". Беларусы выступалі двойчы, на пачатку і бліжэй да заканчэння. Акрамя старых гітоў, як „Одзірыдзідзіна", „Лепей ня будзе" і „Партызанскай" прагучалі таксама дзве зусім новыя песні „Go home" і „Мы пераможам", якія з роўным энтузіязмам былі прыняты тутэйшымі фанамі рока. Гурт Беларусі нумар адзін, як шматкроць называлі „Н.Р.М." вядучыя і журналісты, праспявалі супольна са „Страхамі на Ляхаў" песню „Тры чарапахі" і гімн „Салідарнасці" „Муры". Пасля другога выхаду на сцэну „Н.Р.М." выклікалі на біс і яны паўторна выканалі „Тры чарапахі". Калі музыкі сыходзілі, публіка некалькі разоў праскандавала „Вольна Бялорусь!" і „Дзенкуемы!". На працягу ўсяго канцэрта „Н.Р.М." падтрымлівалі шматлікія сябры Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў Познані, якія разгарнулі бел-чырвона-белыя палотнішчы. Увесь канцэрт трансляваўся польскім рэгіянальным тэлебачаннем і познаньскімі радыёстанцыямі. Па канцэрце праваруч ад сцэны выстраілася чарга ахвотных набыць альбомы і аўтографы. Праграму закончылі агнявое шоу і феерверкі.

Віталь Воранаў

# Адгаданка

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | 32 | 33 | 34 | 35 |
| 36 | 37 | 38 | 39 | 40 | 41 | 42 | 43 | 44 | 45 |

## Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм.

1. пах, паветра, дыханне = 32 _ 39 _ 8 _;
2. сталіца Эквадора = 2 _ 9 _ 35 _ 11 _;
3. горад пры зліцці Сожа з Дняпром = 29 _ 28 _ 34 _ 5 _;
4. народжаная гарою каб ціха сядзець пад мятлою = 38 _ 33 _ 31 _;
5. ніжная канечнасць чалавека = 20 _ 4 _ 25 _ 21 _;
6. небыліца = 23 _ 41 _ 27 _ 37 _ 40 _ 30 _;
7. „Аіда", „Сялянка" = 24 _ 10 _ 16 _ 44 _ 26 _;
8. сасок у млекакормячых жывёл = 17 _ 13 _ 18 _ 42 _ 19 _;
9. кругавая ў Яна Чыквіна = 36 _ 43 _ 3 _ 45 _;
10. вострая інфекцыйная хвароба Камю = 12 _ 1 _ 22 _ 15 _;
11. службовы разрад служачых = 6 _ 7 _ 14 _. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 31 нумара**

Каўтун, Рым, унія, Яшэн.

Рашэнне: **У труны кішэняў няма.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** і **Васілю Петручуку** з Беластока.

# 11.09 – 17.09



**Баран (21.03. — 19.04.)** 11-15.09. адчуеш прыліў вітальных сіл, пастаўіш на самастойнасць і шмат што зможаш зрабіць. З 14.09. да 18.09. будзеш рашучы, здольны да хуткіх і трапных вырашэнняў, узрасце твая творчая ініцыятыўнасць.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Хутчэй спадабаешся, калі будзеш ахутаны аўрай таямнічасці. Трымайся здалёк ад інтрыг, якія снуе хтосьці на працы. Дома рух як на аўтастрадзе.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** З 14.09. пераможаш стэрэатыпы і прадузятасці, адкрыешся на новыя магчымасці. Тое, што вас дзяліла, цяпер з'яднае. З 14.09. да 18.09. несвядома паддасіся ўплывам непрыхільных табе людзей. Будзь пільны — вакол цябе ваўкі ў авечай скуры!

**Рак (22.06. — 22.07.)** Да 13.09. не разлічвай на прыхільнасць атачэння. Цяжка паразумецца з раднёй і суседзямі. Працуючы салідна, спадзявайся ўзнагароды. Дарэчы, і так атрымаеш неспадзяваную ўзнагароду.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Да 15.09. прылію вялікай энергіі. Бярыся за закінутыя праекты і інтарэсы, усё ўдасца. Пасля 16.09. выберыся ў падарожжа, пазнаёмішся з вельмі цікавымі людзьмі, якія табою захопяцца. 12-16.09. — час не вельмі карысны для твайго здароўя; будуць людзі, якія захочуць цябе шантажыраваць, упірацца, каб ты зрабіў тое, чаго не хочаш.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Да 20.09. у тваім знаку Меркурый — спрытны патрон гандлю, інтарэсаў і бліскучых ідэй. Добрыя падарожжы, сустрэчы. З 14.09. нездаровае суперніцтва, падазронасць, зайздрасць і празмерная ўпартасць.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** З 16.09. можаш хавацца ад людзей і цяжка будзе табе выявіць свае пачуцці. Нялёгкія хвіліны для Шаляў, перажываючых крызіс у сужонстве. Грошай хопіць.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** З 11.09. атмасфера фліртаў і раманавых кліматы. 12-16.09. можаш нарвацца на кагосьці, каго не пераможаш. Можа захацецца „адыграцца" на слабейшым. Такая асляпляючая зайздрасць, што будзеш апаскі і боязь прымаць за рэальнасць.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** З 16.09. вельмі ўзмоцніцца твая псіхічная моц. Сяброўства можа перарасці ў вялікае каханне. Не разлічвай на тое, што шэф аддасць табе сваю пасаду па старому знаёмству!

**Казярог (22.12. — 20.01.)** 12-16.09. паявяцца цяжкасці ў рэалізацыі амбіцыйных планаў. Калі агорне цябе знеахвочанне, не разлічвай на поспех; вельмі файная нагода можа прамільгнуць табе каля носа! З 16.09. не плануй ніякіх рандэву.

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** З 16 па 20.09. ты непераможны ў любоўных кантактах. Будзеш хуткі да раманаў на працы, але і да сварак з шэфам.

**Рыбы (20.02. — 20.03.)** Да 14.09. непрыемнасці звязаныя з інтрыгамі, у якія хтосьці захоча цябе ўвалачы. Не думай задоўга, калі атрымаеш прапанову новай працы.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960